

ШАЛЁНЫЯ РЫТМЫ НЬЮ-ЁРКА **10**



ХТО ПРАДСТАВІЦЬ БЕЛАРУСЬ НА «СЛАВЯНСКІМ БАЗАРЫ»? **11**


15 ЧЭРВЕНЯ 2019 г.
СУБОТА
№ 111 (28978)

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА


# АБ'ЯДНАЦЬ, А НЕ СУТЫКАЦЬ

## Сістэма глабальнай бяспекі трашчыць па швах

**Аб гэтым заявіў Аляксандр Лукашэнка, прымаючы ўдзел у саміце Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва ў Бішкеку. Дарэчы, па выніках пасяджэння была падпісана Бішкекская дэкларацыя, а таксама каля 20 іншых дакументаў.**



Фота БелТА.

Беларускі лідар выступіў перад прысутнымі на пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў у пашыраным складзе — прыводзім асноўныя тэзісы з прамовы Прэзідэнта.

Паводле яго слоў, сёння відавочна, што міжнародная сістэма, якая функцыянавала больш-менш эфектыўна пасля Другой сусветнай вайны, трашчыць па швах. У ваеннай сферы ідзе дэмантаж стрымальных стратэгічных дамоўленасцяў і скочванне да гонкі ўзбраенняў, у палітыцы размова вядзецца толькі на мове канфрантацыі, а эканоміка і гандаль выкарыстоўваюцца як інструмент варожага ўздзеяння...

«На змену зразумелым для ўсіх правілам гульні прыходзіць анархія», — рэзюмаваў ён.

Прэзідэнт Беларусі звярнуў увагу, што ў свой час краіны шмат спадзяваліся на глабалізацыю, мяркуючы, што яна прынясе збаўленне ад усіх бед і няшчасцяў. Пакуль жа складваецца ўражанне, што выйгрыш ад гэтага працэсу аказаўся значна меншым.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: без цеснага ўзаемадзеяння ў рамках шматбаковых структур, без выпрацоўкі ўзгодненых крокаў немагчыма забяспечыць мір як у рэгіянальным, так і глабальным маштабе. Ён дадаў, што ШАС саспела для таго, каб больш актыўна і настойліва садзейнічаць выстройванню міжнароднай палітыкі на прынцыпах міру, узаемнай павагі і раўнапраўя. «Арганізацыя можа і, галоўнае, павінна (гэтага чакаюць людзі) садзейнічаць нейтралізацыі пагроз у галіне бяспекі, вызначэнню агульных поглядаў і ўзаемадзеяння ў эканамічнай сферы», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Таксама Прэзідэнт агучыў прапановы нашай краіны па развіцці дзейнасці арганізацыі.

Па-першае, беларускі лідар прапанаваў падумаць аб новых формах дзейнасці ШАС на міжнароднай арэне. Напрыклад, можна прымаць сумесныя заявы па актуальных пытаннях у парадку дня ААН.

Па-другое, Беларусь лічыць вельмі важным дамагчыся таго, каб тэма шматбаковага дыялогу па праблематыцы бяспекі стала дамінуючай у сучасным міжнародным жыцці.

Па-трэцяе, кіраўнік беларускай дзяржавы ўказаў на неабходнасць выкарыстоўваць аб'яднаўчую прыроду міжнародных арганізацый для кансалідацыі іх намаганняў у сферы глабальнай бяспекі. Паводле яго слоў, у гэтым плане важным крокам магла б стаць нефармальная сустрэча генеральных сакратароў ААН, АБСЕ, ШАС, СНД, НАТА і АДКБ у мэтах абмеркавання назапашаных пытанняў забеспячэння стабільнасці ў свеце.

Іншы важны момант — вядзецца шмат размоў аб спалучэнні розных інтэграцыйных працэсаў — Еўразійскага эканамічнага саюза, ініцыятывы «Пояс і шлях», іншых. «Разам з тым, на нашу думку, мы павінны быць больш актыўнымі ў распрацоўцы і рэалізацыі сумесных праектаў у важных для нашых дзяржаў сферах: харчовая бяспека, транспарт і лагістыка, энергетыка, інавацыйныя тэхналогіі», — упэўнены Прэзідэнт.

Ён таксама адзначыў, што кіраўнікі дзяржаў ШАС прынялі на саміце шэраг дакументаў, накіраваных на далейшае ўзмацненне барацьбы з тэрарызмам і злачыннай дзейнасцю, — Беларусь цалкам падтрымлівае гэтыя рашэнні і гатова да практычнага ўзаемадзеяння.

Яшчэ Аляксандр Лукашэнка адзначыў надзвычайную важнасць больш цеснага ўзаемадзеяння па актуальных для ўсіх пытаннях забеспячэння інфармацыйнай бяспекі і барацьбы з кіберзлачынствамі.

Падводзячы вынік, ён заявіў, што прыкладам эфектыўнага супрацоўніцтва на прасторы ШАС могуць быць Кітай і Расія — тавараабарот у іх значны і працягвае расці. Працэс развіваецца без шуму, і цяпер з такім становішчам рэчаў лічацца ўсе гульцы.

Аляксандр Лукашэнка звярнуўся з просьбай да буйных сусветных дзяржаў, у тым ліку прадстаўленым у ШАС, каб яны ў супрацоўніцтве таксама не забывалі аб малых і сярэдніх краінах, больш актыўна ўключалі іх у гандаль, у эканамічнае ўзаемадзеянне.

СТАР. 2

# НА ДЗЯЖУРНАЙ ЗМЕНЕ



Бальніца сястрынскага догляду ў вёсцы Шапялевічы Круглянскага раёна заснавана восем гадоў таму на базе сельскай участковай бальніцы — равесніцы вызвалення Беларусі. Калі дакладней, першага жніўня 1944 года ў адной з ацалелых хат (вёску спалілі, засталося толькі сем пабудоў) была адчынена лякарня: людзі хварэлі на малярыю, сыпны тыф. А цяпер у сценах бальніцы знайшлі сабе прытулак дваццаць нямоглых і адзінокіх старых. Ім дапамагае медыцынскі персанал — сёстры, санітаркі, кухары, падсобныя рабочыя, загадчык гаспадаркі. На дзяжурнай змене, калі мне давялося наведаць гэтую міласэрную ўстанову, працавалі Тацццяна ВЛАДЫКА, Тамара ШАРОЙКА, Ларыса ШМЯРКО, Наталля ШАРАПАВА, Валянціна ПАЛУДА, Вольга АСЕЦКАЯ (усе яны на гэтым фота).

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Алег ТОКУН, начальнік упраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны:**

*«Сітуацыя на рынку працы сёння спрыяльная для тых, хто шукае работу. Устойлівы попыт на супрацоўнікаў з боку наймальнікаў мы фіксуем ужо на працягу двух гадоў. Толькі ў нашым афіцыйным банку вакансій на партале дзяржаўнай службы занятасці больш за 80 тысяч вакансій. Вядома, структура розная: больш за 60 % — прапановы па рабочых спецыяльнасцях. Заробкі таксама розныя: ёсць прапановы і па Br400—500, але ёсць і па Br1000, і больш. У топе запатрабаваных рабочых прафесій сёння — кіроўца аўтамабіля, швачка, прадавец, машыніст, повар, муляр, электрагазазваршчык. Сярод вакансій служачых шмат запытаў на ўрачоў, ветэрынараў, бухгалтараў, інжынераў па ахове працы і г. д. Апошнія тры гады нязменна высокі попыт на IT-спецыялістаў для розных галін».*

Разумныя грошы

# КАБ НЕ ПЛАЦІЦЬ ДВОЙЧЫ

## Ні ў якім разе не кладзіце «пластык» праязнога побач з банкаўскімі карткамі. А лепш — насіце картку ў фользе

**Пачнём з дробязяў. У гарадскога жыхара абавязкова ёсць цэлы стос пластыкавых картак, банкаўскіх, праязных, крамных, любых. У гэтым выпадку спатрэбяцца своеасаблівыя візітоўніцы — зусім не цацанкі, а аксесуары, якія здаўна лічыліся адным з прыкмет сацыяльнага і дзелавога статусу. Іншая назва — картхолдар, утворанае ад англійскіх слоў «card» і «holder» — наогул карткатрымальнік.**

Я таксама палічыў, што гэты выраб упарадкуе і захавае ўсе мае карткі, узяў і зрабіў картхолдар сваімі рукамі. Маё штодзённае жыццё змянілася ў лепшы бок. У адным месцы ў мяне былі сумешчаны праязны на метро, аўтобус і трамвай; зарплатная банкаўская картка; «пластык» інтэрнэт-банкінгу майго любімага банка і карта лаяльнасці майго найлепшага магазіна. Усё пад рукой. Картхолдар з гэтым наборам картак я не змяняю ўжо мінімум тры гады. Дакладней — не мяняў. Мая зарплатная картка стала злёгку сціраецца і патрабавала замены. У аддзяленні банка мне параілі ўзяць больш сучасную картку з чыпам, тую, якая бескантактавая. Параілі, але папярэдзілі...

Аказваецца, цяпер, калі я паднясу свой карткатрымальнік да турнікета на станцыі метро, каб такім чынам актывізаваць мой пластыкавы праязны, то ў мяне адначасова спішуць 65 капеек і з банкаўскай карткі. Як так? Але я не жадаю плаціць за адну паездку двойчы. Хто верне мне залішне аплачаныя грошы? Аказваецца, ужо ніхто нічога не верне. І вось чаму.

Усе мы, наведваючы метро, апрыёры павінны ведаць пэўныя інструкцыі. Зараз падрыхтаваны і вывешаны ў метро і на сайце новыя правілы праходу пасажыраў на станцыі метрапалітэна праз аўтаматычны турнікет з выкарыстаннем жэтона, праязнога білета на бескантактавай смарт-карце і банкаўскай бескантактавай карты.

Там гаворыцца, што калі пасля размяшчэння ў зоне счытвання бескантактавай смарт-карты чутны гукавы сігнал і на інфармацыйным табло турнікета высвятляецца надпіс «СКОНЧАНЫ ПАЕЗДКІ», «НЕ ГОДНЫ», «НЕ ЧЫТАЕ», «РАНА» — гэта азначае, што ўваход на станцыю не дазволены, а картка не прымаецца турнікетам па адной з прычын.

СТАР. 2

І мы там былі!

# ПАДАРОЖЖА Ў ПЧАЛІНАЕ ЦАРСТВА

## «Звязда» высвятляла, як робіцца правільны мёд

**Спадзяюся, мой подзвіг будзе ацэнены. Бо, выконваючы баявое заданне, я атрымала вытворчую траўму. Нават у маскіровачнай экіпіроўцы адна з пчол зразумела, што ў святая святых трапіў чужынец, і ўджаліла мяне ў непрыкрыты палец. Ён распух на вачах. Але гаспадар адразу ж знайшоўся, што сказаць: «Не хвалюйцеся, гэта самая надзейная прышчэпка ад прастуды». Ну што ж, праверым.**

СТАР. 8



Мядовы пакой.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### БОРЫС ДЖОНСАН ВЫЙГРАЎ ПЕРШЫ ТУР ВЫБАРАЎ ЛІДАРА ТОРЫ



У першым туры, у якім галасавалі 313 дэпутатаў палаты абшчын ад Кансерватыўнай партыі, былы міністр замежных спраў Борыс Джонсан атрымаў 114 галасоў. За яго галоўных канкурэнтаў, цяперашняга кіраўніка МЗС Джэрэмі Ханта і міністра навакольнага асяроддзя Майкла Гоўва, прагаласавалі 43 і 37 калег-дэпутатаў адпаведна. Трое з дзесяці кандыдатаў — Андрэа Ледсам, Эстэр Маквей і Марк Харпер — выбылі з барацьбы, не пераадолеўшы прахадны бар'ер у 17 галасоў. У наступны тур таксама выйшлі былы міністр па «брэксіце» Дамінік Рааб (27 прыхільнікаў), міністр унутраных спраў Саджыд Джавід (23), міністр міжнароднага развіцця Роры Сцюарт (19) і міністр аховы здароўя Мэт Хэнкак (20). Выбары з паступовым выбываннем працягнуцца на наступным тыдні, і галасаваць у наступных турах па-ранейшаму будуць толькі торы-дэпутаты Палаты абшчын. Не пазней за 20 чэрвеня кандыдатаў павінна застацца толькі двое, і выбіраць з гэтых двух фіналістаў будуць ужо ўсе члены Кансерватыўнай партыі — каля 160 тысяч чалавек.

### У КІТАІ ПАДЛІЧЫЛІ ШКОДУ АД СТЫХІЙНЫХ БЕДСТВАЎ

Больш за 80 чалавек сёлета загінулі або прапалі без вестак у Кітаі ў выніку стыхійных бедстваў, у прыватнасці паводак на поўдні краіны, заявіў кіраўнік дэпартамента нацыянальнага кантролю за паводкамі і засухамі Е Цзяньчунь. У паўднёвых рэгіёнах Кітая ў пачатку лета штогод пачынаюцца паводкі, у той час як у паўночных надыходзіць перыяд засухі. Улады праводзяць у затопленых раёнах масавую эвакуацыю, аднак пазбегнуць няшчасных выпадкаў не ўдаецца. «У большасці правінцый зарэгістраваныя паводкі, мацней за астатніх пацярпелі паўднёвыя раёны — Гуансі-Чжуанскі аўтаномны раён, правінцыя Цзянсу, Фуцзянь і Гуандун. Па ўсёй краіне ў зоне бедства ад паводак апынуліся 6,75 мільёна чалавек, што на 48 працэнтаў менш за сярэдняе значэнне апошніх пяці гадоў, якое складае 12,8 мільёна чалавек. Непасрэдны эканамічны ўрон склаў 10 мільярдаў юаняў (каля 1,5 мільярда долараў), што на 41 працэнт менш за сярэдні паказчык апошніх пяці гадоў», — паведаміў Е Цзяньчунь. Паводкі прынеслі значны ўрон сельскагаспадарчым угоддзям — плошча затопленых сельскагаспадарчых зямель перавысіла 623 тысячы гектараў.

### AMAZON СТАЎ САМЫМ ДАРАГІМ БРЭНДАМ У СВЕЦЕ

Амерыканскі анлайн-рэтэйлер Amazon стаў першым у рэйтынгу 100 самых дарагіх брэндаў The BrandZ Global па версіі брытанскіх кампаній WPP і Kantar Millward Brown. Пералік складзены на аснове апытання больш чым 3,7 мільёна спажыўцоў. Так, Amazon паказаў адчувальны рост за 2019 год: яго кошт вырас на 52 працэнты — да 315,5 мільярда долараў. Рэтэйлер павысіў сваю канкурэнтаздольнасць, удасканаліўшы экасістэму, палепшыўшы якасць абслугоўвання і пашырыўшы спіс прапанаваных паслуг. Кампанія Apple заняла другое месца ў рэйтынгу: кошт гэтага брэнда павысіўся амаль на тры працэнты — да 309,5 мільярда долараў. Між тым карпарацыя Google ўпершыню за тры гады апусцілася на трэці радок. Брэндам, які максімальна падаражэў за год, прызнаны Instagram. Сацыяльная сетка, у якой зарэгістравана больш за мільярд карыстальнікаў, стала даражэйшай амаль у два разы ў параўнанні з мінулым годам — яе кошт склаў 28,2 мільярда долараў.

ISSN 1990 - 763X

Я зноў выбіраю «Звязду»



# Здымак для газеты

**Сяброўства са «Звяздой» у Ірыны ГАПЕЕВАЙ, старшага навуковага супрацоўніка Шклоўскага раённага гісторыка-краязнаўчага музея, пачалося, вобразна кажучы, са здымка на першай паласе газеты.**

— Гэта было падчас візіту Прэзідэнта ў наш раён, — усміхаецца яна. — Я суправаджала адну расійскую мастачку, якая ўдзельнічала ў пленэры і збіралася падарыць кіраўніку дзяржавы карціну з краявідамі Шклоўшчыны. І гэты ўрачысты момант зняў фотакарэспандэнт «Звязды». І я, як той казаў, трапіла ў эпахальны кадр. Ён выйшаў на першай старонцы. Прэзідэнт і вакол людзі, сярод якіх і я. Гэты здымак я выразала і захоўваю па сённяшні дзень. Дарэчы, яго копія ў павялічаным памеры размешчана ў нас у музеі. Праўда, на ёй мяне няма — пры апрацоўцы здымка частку давялося абрэзаць. А вось газету я цяпер выпісваю рэгулярна. Купіць яе ў кіёску праблема, не заўсёды прадаецца — выпісаць надзейней. Мне ў ёй падабаецца ўсё: і тое, што яна на беларускай мове, і тое, што ў ёй так шмат цікавых рубрык. З задавальненнем чытаю ўсё, што датычыцца археалогіі, гісторыі — гэта мае профільныя тэмы. Вельмі цікавыя ўкладкі ў газету, шыкоўныя фота. Калі ўпершыню выпісвала, шкада было грошай. Але я пабачыла яе напаўненне і пераканалася, што яно таго варта. Карыстаюся парадамі для садаводаў і агароднікаў, бяру на ўзбраенне некаторыя прыёмы пры правядзенні экскурсій. Адным словам, газета стала для мяне мудрым дарадцам і добрым сябрам.

А карціну, дарэчы, Прэзідэнт перадаў нам у музей са словамі, што гэту прыгажосць павінны бачыць і іншыя. Мы тады якраз толькі адкрыліся, і не хапала экспанатаў. Вельмі былі ўдзячныя за такі падарунак. Цяпер у нас шмат цікавага, а тая карціна займае пачэснае месца ў экспазіцыі.

**Запісала Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота аўтара.**


ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

**Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе**

**Мы абяцаем цікавае лета з любімай газетай**

**ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!**

# АБ'ЯДНАЦЬ, А НЕ СУТЫКАЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На палях саміту ШАС адбыўся шэраг двухбаковых сустрэч Аляксандра Лукашэнкі і лідараў іншых краін.

Да пасяджэння Савета кіраўнікоў дзяржаў у пашыраным складзе беларускі лідар пагутарыў з прэм'ер-міністрам Індыі Нарэндрай Модзі. Абмеркавалі рэалізацыю 3—4 ключавых праектаў, былі дадзены адпаведныя даручэнні, а яшчэ кіраўнік дзяржавы запрасіў прэм'ер-міністра Індыі ў Беларусь, запрашэнне было прынята.

Адбылася сустрэча з Прэзідэнтам Афганістана Ашрафам Гані. Вырашана адмовіць дыялог у мэтах рэалізацыі дасягнутых раней дамоўленасцяў.

Яшчэ Прэзідэнт Беларусі сустрэўся з Уладзімірам Пуціным. Апошні быў запрошаны на II Еўрапейскія гульні, абмеркавалі ўдзел у спаборніцтвах расійскіх спартсменаў. Пацвярджаны раней дасягнутыя дамоўленасці аб сустрэчы для абмеркавання пытанняў далейшай інтэграцыі.

Са старшынёй Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпінам беларускі лідар у тым ліку абмеркаваў правядзенне ў ліпені бягучага года міжнароднага форуму ў Кітайска-беларускім індустрыяльным парку «Вялікі камень».

Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы сустрэўся з Прэзідэнтам Узбекістана Шаўкатам Мірзіёевым, з Прэзідэнтам Кыргызстана Сааранбаем Жээнбекавым і Прэзідэнтам Таджыкістана Эмамалі Рахмонам.

**Паводле БелТА.**

# Лячыць, аблягчаць, ратаваць

**Напярэдадні Дня медыцынскага работніка выдатнікаў прафесіі запрасілі наведаць Палац Незалежнасці — месца, дзе праходзяць найважнейшыя дзяржаўныя мерапрыемствы: ад уручэння пасламі даверчых грамат да нарад і сустрэч самага высокага ўзроўню. Знакамітыя свваімі падзеямі залы, падарункі кіраўніку дзяржавы, фатаграфіі знакавых сустрэч — усё гэта на сваё вочы ўбачылі работнікі сферы аховы здароўя.**

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка накіраваў віншаванне работнікам аховы здароўя з прафесійным святам. Кіраўнік дзяржавы выказаў упэўненасць, што дзякуючы пераемнасці традыцый, гуманнасці і міласэрнасці, вернасці медыкаў выбранаму шляху і самаадданаму служэнню людзям айчынная ахова здароўя заўсёды застанецца на вышыні, а медыцынскія работнікі будуць карыстацца заслужанай павагай і даверам.**

Пакуль гасцям Палаца праводзілі экскурсію, з журналістамі пагутарыў новы міністр аховы здароўя Уладзімір Каранік. Ён расказаў, што ў Беларусі ў сістэме аховы здароўя працуе больш за 250 тысяч работнікаў. Трэба разумець, што моцная сучасная сістэма аховы здароўя — фактычна адзін з атрыбутаў незалежнасці. Таму і ўзнікла ідэя для тых урачоў, якія з'яўляюцца пераможцамі конкурсу «Урач года», выдатнікамі аховы здароўя, правесці экскурсію ў сімвале незалежнасці нашай краіны — у Палацы», — адзначыў навапрызначаны міністр, выказаўшы надзею, што наступны раз хто-небудзь з прысутных на экскурсіі апынецца ў Палацы Незалежнасці з іншай нагоды — для ўзнагароджання або прызначэння на новую пасаду.

...Прафесара кафедры акушэрства і гінекалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Вольгу Перасаду журналісты выцягваюць на размову, калі экскурсія перамяшчаецца на другі паверх. Яна адзначыла, што даўно хацела пабываць у Палацы Незалежнасці. «Нарэшце мара спраўдзілася», — сказала прафесар. Па яе словах, нягледзячы на тое, што Палац быў пабудаваны нядаўна, будынак ужо валодае вялікай гісторыяй, і, наведваючы гэта месца, ёй удалося адчуць важнасць і цяжкасць працы кіраўніка дзяржавы, урада і чыноўнікаў.

Падзялілася ўражаннямі ад наведвання Палаца Незалежнасці і Марыя Лапцейкіна — урач-стаматолаг 13-й гарадской стаматалагічнай паліклінікі. «Наогул нечаканы і вельмі прыемны падарунак, які выклікаў шмат эмоцый. Вельмі прыгожа, выдатна мець такую магчымасць, зазірнуць у святая святых», — сказала яна пра экскурсію.

Дзяўчына з'яўляецца маладым спецыялістам, як жа яна ацэньвае стварэнне ўмоваў для ўчарашніх выпускнікоў? «Вядома, трошкі складана, пакольні тое, чаму ты вучышся, аказваецца не зусім тым, з чым сутыкаешся ў рэчаіснасці. Ёсць нейкія ліміты па часе, па ўмовах... Хацелася б нешта больш сучаснае часам мець у рабоце», — дадала Марыя Лапцейкіна.

Загадчык хірургічнага аддзялення Слуцкай цэнтральнай раённай бальніцы Дзмітрый Царыкаў паведаміў журналістам, што сёння ў буйных раённых бальніцах узровень аказання ў тым ліку і хірургічнай дапамогі практычна не адрозніваецца ад рэспубліканскіх, абласных устаноў. Так, у некаторых бальніцах ёсць самае сучаснае абсталяванне, з дапамогай якога дыягностыку можна правесці на вельмі высокім узроўні.

Параўноўваючы цяперашні ўзровень медыцыны ў краіне і ўзровень сярэдзіны 80-х гадоў мінулага стагоддзя (калі ён прыйшоў у прафесію), спецыяліст кажа коратка — «неба і зямля». Што датычыцца візіту ў Палац Незалежнасці, як адзначыў Дзмітрый Царыкаў, яго вельмі ўразіла веліч гэтага будынка. «Вельмі радасна, што тут практычна ўсё зроблена з беларускіх матэрыялаў і нашымі спецыялістамі. Гонар бярэ за краіну, што мы можам зрабіць і гэта, і тое. Мы многае можам», — рэзюмаваў спецыяліст.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

## ІНТЭРНАТ ДЛЯ МЕДЫКАЎ

**Урачыстае адкрыццё інтэрната для работнікаў Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы адбылося 14 чэрвеня ў Бараўлянах.**

Інтэрнат разлічаны на 116 месцаў, тут створаны камфортныя ўмовы пражывання як для сямейных медыкаў, так і для іх калег, якія пакуль не пабраліся шлюбам. У пакоях блочнага тыпу прадугледжаны кухні і санітарныя вузлы. Пакоі цалкам абсталяваны неабходнай бытавой тэхнікай і мэбляй: халадзільнікамі, электраплітамі, печкамі-ЗВЧ, кухоннымі мыйкамі, шафамі, ложкамі, тумбачкамі, сталамі. На кожным паверсе ёсць агульныя кухні, пакоі для адпачынку, дзіцячыя гульнявыя пакоі, памяшканне, з пральнымі машынамі, прасавальнымі дошкамі. Для людзей з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі створана безбар'ернае асяроддзе. Каля будынка інтэрната абсталявана дзіцячая пляцоўка, стаянка для аўтамабіляў і веласіпедаў з двума асобнымі ўездамі, арганізавана відэаназіранне на тэрыторыі і ў месцах агульнага карыстання.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# ЗВЯРНУЎСЯ? ДАПАМОГУЦЬ

## На кантролі засталіся 102 звароты з 2,5 тысячы, што паступілі да «Вялікай размовы з Прэзідэнтам»

**Аб гэтым паведаміла кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Наталля КАЧАНАВА.**

«Аналіз, які мы правялі, паказаў, што каля 40 % пытанняў датычыліся кампетэнцыі мясцовых органаў улады, а каля 40 % пытанняў адносіліся да рэспубліканскіх органаў улады», — расказала яна.

Адміністрацыя Прэзідэнта не проста накіроўвала пытанні ў ніжэйстаячыя структуры, але і кантралявала іх рашэнне, адзначыла Наталля Качанава. «Пасля таго, як мы атрымлівалі адказы, часта выязджалі, маніторылі сітуацыю і правяралі. Шмат у чым рашэнні былі прынятыя хутка і аператыўна», — дадала яна.

Безумоўна, для вырашэння некаторых пытанняў спатрэбілася нямала часу. Яны датычыліся заканадаўчых актаў, удасканалення той ці іншай сістэмы — таму застаўся невялікі працэнт зваротаў. Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта запэўніла, што яны застануцца на кантролі і будуць разгледжаны да ўстаноўленым парадку.

Цікава, што людзі пісалі не толькі пра асабістыя праблемы, але выказваліся аб становішчы спраў у тым ці іншым рэгіёне. Аказалася, кожную вобласць хвалююць розныя сферы, напрыклад, Віцебскую — рамонт дарог і добраўпарадкаванне тэрыторый.

Наталля Качанава звярнула ўвагу, што з дапамогай зваротаў можна даць ацэнку рабоце на месцах. «Гэтая акцыя паказала, што ў людзей ёсць пытанні, якія яны і задавалі кіраўніку нашай дзяржавы. Пацвердзілася існа, што людзі давяраюць нашаму Прэзідэнту і імкнуцца вынесці такія пытанні менавіта на яго разгляд», — адзначыла яна.

**Паводле БелТА.**

# Бязвыплатна не значыць бясплатна

**Учора, у Сусветны дзень донара, у падтрымку бязвыплатнага донарства здалі кроў міністр аховы здароўя Уладзімір Каранік, член Савета Рэспублікі, кіраўнік Мінскага навукова-практычнага цэнтра хірургіі, транспланталогіі і гематалогіі Алег Румо, дэпутат Палаты прадстаўнікоў, генеральны сакратар Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Вольга Мычко, дэпутат Палаты прадстаўнікоў, старшыня Беларускай асацыяцыі ўрачоў Дзмітрый Шаўцоў, прадстаўнік Сусветнай арганізацыі аховы здароўя ў Беларусі Батыр Бердыклычаў.**

— Я анколаг, Алег Алегавіч (Румо. — **Аўт.**) — трансплантолаг, і мы разумеем, наколькі важнае забеспячэнне прэпаратамі крыві, — растлумачыў падчас акцыі Уладзімір Каранік. — Гэта бяспека пацыентаў і магчымасці ўрачоў выконваць пэўныя ўнікальныя аперацыі. Зараз у грамадстве ўзнікла нейкае непаразуменне: маўляў, калі мы прапагандуем бязвыплатнае донарства, значыць грошай на кроў няма, а ўрачам не хапае прэпаратаў крыві. На самай справе гэта не так. Бязвыплатна не значыць бясплатна. Такім чынам дзяржава стымулюе сацыяльную адказнасць грамадзян. І ў нашым грамадстве ўжо нямала тых, хто разумее, што некаму патрэбна іх дапамога, і аказвае яе. Пры гэтым дзяржава кампенсуе мерапрыемствы для захавання здароўя донараў. Магчымасць дапамагчы бліжняму павінна быць асноўным пабуджальным фактарам.

Алег Румо расказаў, што кроў і яе кампаненты часта патрабуюцца пры самых складаных аперацыйных умяшальніцтвах:

— Здараюцца такія аперацыі, калі кроў пацыенту прыходзіцца мяняць пяць разоў. Улічваючы, што ў нашым арганізме ў сярэднім пяць літраў, то на працягу некалькіх гадзін трэба пераліць 25 літраў крыві. Дзяржава нясе каласальныя расходы на выкананне такога роду ўмяшанняў. І сэнс донарства — прычыніцца да таго, што нехта сёння паправіўся, што цяжкі пацыент не стаў інвалідам, што сістэма без цыбе не можа працаваць.

Штогод у Беларусі выконваецца больш за 400 тысяч пераліванняў крыві і яе кампанентаў. Ад аднаго донара можна атрымаць тры кампаненты крыві, гэта значыць выратаваць тры жыцці.

У нашай краіне амаль 85 тысяч донараў цэльнай крыві і амаль 13 тысяч донараў яе кампанентаў. Паступова колькасць платных данацый зніжаецца. За апошнія пяць гадоў здаваць кроў бясплатна сталі ў 16 разоў часцей, яе кампаненты — больш чым у 20 разоў. Летась кожны чацвёрты донар задаваў кроў бязвыплатна.







Кроў здае міністр аховы здароўя Уладзімір КАРАНІК.

— Штогод колькасць донараў прырастае на 10 %, і летась 98 тысяч нашых грамадзян сталі донарамі, — расказвае **дырэктар РНПЦ трансфузіялогіі і медыцынскіх біятэхналогій Фёдар КАРПЕНКА.** — Па ацэнках Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, мы павінны нарыхтоўваць не менш за 20 літраў донарскай крыві на адну тысячу насельніцтва. У нас гэты паказчык больш за 23 літры. Ні адна аперацыя не была сарвана, не было ніводнага выпадку неаказання медыцынскай дапамогі з-за нястачы крыві і як кампанентаў.

У будучым плануецца зрабіць донарства цалкам бязвыплатным. Пераход на такую сістэму прадыктаваны ў тым ліку і Мельбурнскай дэкларацыяй, прынятай 14 чэрвеня 2009 года, якая заклікае краіны свету дасягнуць 100-працэнтнага дабравольнага бязвыплатнага донарства ўжо да 2020 года. Сёння больш за сем дзясяткаў краін забяспечваюць 90 % сваіх запасаў крыві бязвыплатнымі данацыямі, і амаль у столькі ж краінах гэты паказчык складае 100 %.

— Тут выкарыстоўваецца прынцып фінансавай нейтральнасці — ні дзяржава, ні донар ад данацыі не павінны атрымаць фінансавы прыбытак, але і не павінны панесці фінансавых страт. Пры гэтым донар вызваляецца ў дзень данацыі ад працы з захаваннем сярэдняга заробку, забяспечваецца харчаваннем, яму кампенсуюць расходы на дарогу. Як паказвае міжнародны вопыт, такая кроў самая бяспечная, бо донар зацікаўлены весці здаровы лад жыцця, рыхтавацца да данацыі, — тлумачыць Фёдар Карпенка.

Бязвыплатнае донарства будзе замацавана і на заканадаўчым узроўні. Як паведаміла Вольга Мычко, законапраект «Аб змяненні законаў па пытаннях донарства крыві і яе кампанентаў» прайшоў першае чытанне. Новы нарматыўны дакумент, паводле яе слоў, накіраваны не на напаўненне бюджэту, а на стымуляванне адказнасці грамадства. Сацыяльны пакет для пастаянных донараў, згодна з новым дакументам, будзе павялічаны.

— Чырвоны Крыж цалкам падтрымлівае бязвыплатнае донарства. За апошні тыдзень дзякуючы мерапрыемствам нашай арганізацыі здадзена 500 бязвыплатных данацый. У Гомелі, напрыклад, усе дэпутаты гарадскога Савета бязвыплатна здалі кроў, — падзялілася Вольга Мычко.

**Алена КРАВЕЦ.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

# КАБ НЕ ПЛАЦІЦЬ ДВОЙЧЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Крыху ніжэй чырвонай фарбай напісана:

**Каб пазбегнуць непажаданага спісвання паездак або грашовых сродкаў, неабходна прыкладваць да валідатара толькі тую картку, з дапамогай якой пасажыр жадае аплаціць праезд.**

Вось яно дзе «акапалася»... Атрымліваецца, што мы з вамі, праходзячы ў метро, пагаджаемся з тым пастулатам, быццам усе гэтыя правілы ўжо ведаем. А калі я не згодны, хай нават па няведанні, плаціць за паездку двойчы?

Дзеля чаго, скажыце вы, я тут хвалю паднял? Падумаеш, адзінкавы выпадак... А вось і не адгадалі. Апошнім часам неадназова бачыў, калі да валідатара (прычым не толькі к метро, аплата бескантактнай картай праезду ў іншых відах транспарту — пытанне найбліжэйшай будучыні) падносілі не толькі картхолдары з празным, а партманеты, пухлявыя кашалькі, кампактныя і не вельмі сумачкі, партфелі і нават заплечнікі. Хто з упэўненасцю скажа, што ў гэтых рэчах не было бескантактнай банкаўскай карткі? Пытанні, якія без адказаў.

Але ж... Не ўсе. Напрыклад, было зададзена пытанне: «Чаму пры аплаце праезду ў метро бескантактным спосабам з банкаўскай карты спісваюцца сродкі не адразу пасля кожнай паездкі, а праз некаторы час за некалькі паездак? Вось як адказалі на сайце метрапалітэна:

— У рамках развіцця праекта партнёрамі метрапалітэна ўкаранёна тэхналагічнае рашэнне, якое дазваляе аптымізаваць гэты працэс. У найбліжэйшай перспектыве для зручнасці і камфорту пасажыраў плануецца запусціць інавацыйныя механізмы аплаты праезду, уключаючы магчымасць атрымання скідак і правядзення акцый. На першапачатковым этапе рэалізаваны механізм аб'яднання некалькіх паспяховых аплат праезду, учыненых на працягу 48 гадзін, у адну транзакцыю з аднаразовым спісаннем з рахунку трымальніка карткі. На цяперашнім этапе максімальную колькасць аперацый, якія могуць агрэгавацца ў адну транзакцыю, — не больш за тры паспяховых аплаты праезду. Зыходзячы з дзеючага тарыфу за праезд у метро 0,65 рубля, сума адной транзакцыі не перавышае 1,95 рубля.

## Як абараніць кашалёк ад RFID і NFC-ашуканцаў

Пластыкавыя карткі і дакументы з мікрачыпамі на аснове блізкай радыёсувязі (NFC) або з радыёчастотнымі пазнакамі (RFID) сёння ёсць амаль у кожнага. Імі абсталёўваюцца многія крэдытныя і плацежныя карткі, пасведчанні кіроўцы, празныя білеты на метро і многае іншае. Нягледзячы на сваю зручнасць, абедзве тэхналогіі ўтрымліваюць шмат «дзірак» у плане бяспекі.

Для таго каб цалкам выключыць непажаданыя кантакты са счытвальнымі прыладамі, праграмных сродкаў можа быць недастаткова. Тамy варта звярнуцца да дзедаўскіх метадаў і начыста адрэзаць выпраменьванню шляхі да сваіх картак. Ідэальныя для гэтага два віды матэрыялы — вада і метал.

Вядома, у пакеце з вадой насіць карткі цяжкавата. А вось кавалак звычайнай харчовай фольгі з рулона (пададзіце і дзе шакаладкі — але не з пачка ад цыгарэт) цалкам блакіруе сігналы RFID і NFC. Гэта найбольш эфектыўны і зручны спосаб. **Дастаткова абгарнуць картку фольгай і даставаць з яе толькі ў момант аплаты. Усё.**



Дарэчы, многія заходнія кампаніі патрабуюць ад супрацоўнікаў карыстацца спецыяльнымі паперніцамі і вокладкамі для дакументаў з адпаведным лагатыпам «Protected from RFID». Найбольш выбар аксесуараў, якія блакуюць RFID-сігнал, прапануе адна прыватная кампанія. Частка іх асартыменту выраблена па замове ўрада ЗША для дзяржаўных служачых. Можна знайсці і больш танны варыянт — у інтэрнэт-магазінах ёсць маса разнастайных чахлоў для картак і паперніцаў з металічнымі ўстаўкамі.

На сайтах у інтэрнэце можна набыць вопратку з абаронай ад несанкцыянаванага доступу. Аналагі ёсць. Да таго ж металізаваную тканіну можна знайсці ў продажы і адшываваць ёй кішэні адзення. Дарэчы, ёсць і абароненыя ад бесправаднога ўзлому заплечнікі. Вы скажаце, што нам да гэтага яшчэ далёка, што гэта будучыня. Не, яна стукае ўжо да нас у дзверы. А пакуль...

## Як надоўга захаваць сваю пластыкавую картку?

Банкаўскі «пластык» складаецца з непасрэдна пластыкавага прамавугольніка і аднаго або некалькіх убудаваных носьбітаў інфармацыі (магнітная палоска, чып, мікрасхема). Меры засцярогі для картак з рознымі носьбітамі інфармацыі падобныя. Каб картка пражыла доўга, варта выконваць наступныя.

Нельга трымаць картку побач з металічнымі, выпраменьваючымі радыёхвалі, намагнічанымі прадметамі. Далей ад сотавага тэлефона, мікрахвалёўкі, ключоў, раўтэраў, планшэта, офіснай апаратуры, ігральнай апаратуры, радыё і відэа, магнітаў. Для таго каб картка пачала размагнічвацца, патрэбен даволі цесны і доўгі кантакт з гэтымі прадметамі (акрамя магнітаў). Нічога страшнага не адбудзецца ад таго, што ваш «пластык» менш за гадзіну ляжаў у адной кішэні з тэлефонам. Але ўсё-такі такога сусседства лепш пазбягаць.

Яшчэ адным «ворагам» безнаяўнага кашалька з'яўляецца статычная электрычнасць. Нават такі маленькі зарад здольны пашкодзіць або знішчыць даныя на пластыкавай картцы. Статычную электрычнасць лепш за ўсё назапашваюць звычайны бытавы пыл.

Акрамя гэтага, мікрачасціцы пылу драпаюць малюнкі на карце, з часам робячы чып непазнавальным. Таму картку трэба пастаянна трымаць у чысціні.

Для картак з магнітнай паласой ёсць адна асаблівасць. Тэрмін службы такой палоскі абмежаваны. Гэта звязана і з тым, што яна з часам сціраецца аб счытвальнік, і з тым, што інфармацыя, запісаная на палоску, мае абмежаваную колькасць цыклаў счытвання. Тэрмін службы такой карткі звычайна ад года да двух. Захоўваць такі «пластык» даўжэй гэтага тэрміну не трэба.

Што яшчэ варта сказаць аб мерах засцярогі? Тое, што картку можна гнуць не больш чым на 30 градусаў, інакш можна зламаць унутраную мікрасхему ці пашкодзіць палоску. Картку нельга пакідаць на марозе больш чым пры мінус 20 градусах: пластык можа патрэскацца. Нельга награваць больш чым на плюс 50 градусаў. Нельга кідаць картку ў ваду, у кіслату, бензін, растваральнік, шчолач.

**Сяргей КУРКАЧ.**

На кантролі

# ФРЭЗЕРОЎШЧЫКІ ЎЖО НЕ ПАТРЭБНЫЯ?

**Камітэтам дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці выяўлены хібы пры рэалізацыі праграмы садзейнічання занятасці насельніцтва.**

За апошнія пяць гадоў узровень беспрацоўя па поўначы краіны панізіўся да 0,4 %. Напружанасць на рынку працы скарацілася з 6 % да 0,3 %. Калі ў 2016-м было зарэгістравана каля 5,9 тысячы беспрацоўных, у пачатку бягучага года — дзве тысячы.

Але не занятых у эканоміцы магло быць і яшчэ меней. У Камітэце канстатуюць, што неабходны дадатковыя, больш прагрэсіўныя меры па стымуляванні працоўнай актыўнасці і забеспячэнні занятасці.

Напрыклад, падчас маніторынгу высветлілі, што ў асобных рэгіёнах ўладкоўваецца на работу не больш за 60 % грамадзян, якія атрымалі новую спецыяльнасць. Астатнія паўторна рэгіструюцца ў якасці беспрацоўных. Таму, зразумела, трэба, каб было больш людзей з запатрабаванымі наймальнікамі спецыяльнасцямі.

Напрыклад, на працягу трох апошніх гадоў у вобласці недастаткова забяспечвалася прафесійная падрыхтоўка муляраў — 14 % ад патрэбы, машыністаў кранаў — 5 %, швачак — 7 %. У дэфіцыце токары і фрэзероўшчыкі, але беспрацоўныя на навучанне гэтай спецыяльнасці не накіроўваліся.

Вядома, што ахвотным у ліку іншага дапамагаюць распачаць сваю справу. І пры гэтым аказваецца фінансавая падтрымка. Толькі за апошнія тры гады беспрацоўным было выдадзена 642 субсідыі на агульную суму 1,4 мільёна рублёў.

— Аднак часта субсідыя разглядаецца грамадзянамі не як стымул для арганізацыі прадпрымальніцкай дзейнасці, а ў якасці караткатэрміновай дадатковай крыніцы даходу. Беспрацоўныя, якія атрымалі бюджэтныя сродкі, пасля рэгістрацыі ў якасці прадпрымальнікаў дзейнасць не ажыццяўляюць. Падаткі ў бюджэт не выплачваюць, субсідыі расходуюць на асабістыя патрэбы, — удакладніў **начальнік упраўлення кантролю бюджэтна-фінансавай сферы КДК Віцебскай вобласці Аляксандр КАМІНСКІ.**

З ліку тых, хто атрымаў субсідыі ў 2016—2018 гадах, спынілі дзейнасць або не выканалі дагаворныя ўмовы дзяржпадтрымкі 115 чалавек, або 23,4 %.

Дзяржкантралёры высветлілі, што адказнымі асобамі не заўсёды адсочваецца мэтавае выкарыстанне субсідыі і не прымаюцца меры па вяртанні ў бюджэт такіх сродкаў.

Напрыклад, у Гарадоцкім раёне грамадзянін зарэгістраваў у 2016 годзе сялянска-фермерскую гаспадарку. Ён планаваў заняцца вырошчваннем гароднiны і за кошт субсідыі (2,5 тысячы рублёў) набыў абсталяванне. Аднак гаспадарка да ажыццяўлення дзейнасці не прыступала, падаткі ў бюджэт не выплачвала, а ў траўні мінулага года была ліквідавана.

— Разам з тым, ва ўпраўленне па працы райвыканкама грамадзянінам былі прадстаўлены фотаздымкі ўзараных зямель. Плюс — даведка аб адсутнасці даўгоў перад бюджэтам з падатковай інспекцыі. Апошнія і не маглі ўтварыцца з прычыны неажыццяўлення дзейнасці. Меры па вяртанні субсідыі ў бюджэт упаўнаважаным органам не прымаліся, — удакладніў у Камітэце.

Падобным чынам у Верхнядзвінскім раёне ў маі пазамінулага года беспрацоўнаму была дадзена субсідыя — 2,7 тысячы рублёў. Гэтыя грошы мужчына меў намер укласці для арганізацыі грузавых перавозак. Аднак праз адрамантаваў асабістае аўто. Жыхар глыбінкі не прыступіў да прадпрымальніцкай дзейнасці і на працягу наступнага года. Але раённае ўпраўленне па працы больш чым паўгода не прымала мер да вяртання субсідыі ў бюджэт. Толькі па прапанове КДК у лістападзе мінулага года субсідыя і пеня (3,2 тысячы рублёў) былі кампенсаваны грамадзянінам у бюджэт у поўным аб'ёме.

Факты аслаблення кантролю за выкананнем умоў дагавораў аб прадастаўленні субсідый і непрыняцця мер па спагнанні ўстаноўлены таксама ў Віцебскім, Сенненскім і Аршанскім раёнах.

Ёсць яшчэ адзін цікавы факт.

— Працоўная занятасць навучэнцаў у вольны ад вучобы час, як правіла, арганізуецца па месцы іх навучання. Яны займаюцца падсобнымі работамі пры правядзенні рамонту (парафобука падлог і сцен, зборка крэслаў) і добраўпарадкаванні (высадка саджанцаў, прапалка тэрыторый). Накіраванне на прадпрыемствы не ажыццяўлялася, — канстатавалі ў ведамстве.

Вынікі маніторынгу разгледжаны на калегіі КДК Віцебскай вобласці. Аблвыканкаму ўказалі на неабходнасць неадкладнай ліквідацыі праблем і недахопаў. Таксама выпрацаваны прапановы па далейшым правядзенні мэтанакіраванай і эфектыўнай работы ў сферы садзейнічання занятасці насельніцтва.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## Валерый КАЛАДЗІНСКІ:

# «ТРЭНЕРАМ НАРАДЖАЮЦЦА»

### Чаму, працуючы ў найлепшым спартыўным цэнтры Аўстраліі, праз 9 гадоў настаўнік па спартыўнай гімнастыцы вярнуўся ў Беларусь



bobrlife.by

**У красавіку гэтага года Валерый Каладзінскі ўзначаліў жаночую зборную па спартыўнай гімнастыцы. Гэта яго трэці прыход на пасаду. Да 2019 года вядомы спецыяліст быў кіраўніком зборнай у 1996-м і 2002-м. Менавіта пры ім на Алімпійскіх гульнях у Атланце беларускі паказалі найлепшы вынік у суверэннай гісторыі, стаўшы шостымі ў камандзе (а Святлана Багінская тады заняла 5-е месца ў апорным скачку). А задоўга да гэтага, у 80-х, Валерый Каладзінскі ў родным Бабруйску знайшоў і прывёў у залу маленькую дзяўчынку Алену Піскун. Ва ўмовах, дзе разгоннай дарожцы не хапала дзясятка метраў, ён здолеў вырасціць з Алены двухразовую чэмпіёнку свету і прызёрку чэмпіяната Еўропы. Аднак у 2004-м пасля доўгіх угавораў, мабыць, апошнім з высокакваліфікаваных трэнераў, Валерый Вікенцьевіч усё ж такі вырашыў з'ехаць працаваць за мяжу.**

У Аўстралійскім інстытуце спорту ён працаваў дзевяць гадоў, падрыхтаваў тытулаваных спартсменаў чужой краіны, але, атрымліваючы заробак у некалькі тысяч долараў, у 2013 годзе ўсё роўна вырашыў вярнуцца ў Бабруйск. Спачатку займаўся аднаўленнем пасля родаў уласнай дачкі (Ванесы Каладзінскай — двухразовай чэмпіёнкі свету па барацьбе), а потым стаў дапамагаць мясцовым настаўнікам з трэніроўкамі дзяцей. І толькі ў 2019-м спецыяліста запрасілі ў зборную краіны. Пра жыццё ў Аўстраліі і гімнастыку ў Беларусі Валерый Вікенцьевіч расказаў у інтэрв'ю «Звяздзе».

## «Вярнуўся, але аказаўся нікому не патрэбен»

***— Валерый Вікенцьевіч, вы вярнуліся з Аўстраліі ў 2013-м, а пачулі мы пра вас толькі цяпер...***

— Вярнуўся, але аказаўся нікому не патрэбны. Паўгода пасля вяртання валяў дурня. Пазней якраз нарадзіла Ванеса і захацела вярнуцца ў вялікі спорт, таму прапанавала мне папрацаваць з ёй над аднаўленнем. Гэта зручна — калыску прывезла, у куток паставіла, дачка займаецца, калі немаўля заплакала, я падбег, паглядзеў яго. Потым дапамагаў трэнерам, якія давяралі мне сваіх дзяцей. Адну дзяўчынку паднялі ў 2016 годзе на добры ўзровень, па складанасці сваіх элементаў яна была найлепшая ў краіне, выканала ўсе спецпатрабаванні для дарослых, хоць ёй было тады трынаццаць. Я заўсёды пачынаў з нуля, як з Ленкай Піскун, з самага дзяцінства. Нават калі пераехаў у Аўстралію, першы год працаваў там з самымі маленькімі.

Перад маім вяртаннем у Беларусь размаўляў з ранейшым старшынёй Асацыяцыі гімнастыкі. У іх было жаданне вярнуць мяне трэнерам у зборную, але потым змянілася кіраўніцтва, прыбралі пасаду дзяржтрэнера. За гэты час у жаночай зборнай памянялася шэсць галоўных трэнераў.

***— Вы ўжо ўзначальвалі жаночую зборную, ведаеце ўсе плюсы і мінусы гэтай працы. Чаму вырашылі вярнуцца на пасаду зноў?***

— Пытанне, навошта мне гэта трэба, задаваў мне і брат, і сын, бо жыццё ўжо пражыта доўгае. Але я заўсёды падыходжу да яго з іншага боку. Дзеці прыходзяць, і ім усё роўна, што мы можам, у якім узросце знаходзімся, якая эканамічная сітуацыя ў краіне і ў канкрэтнай гімнастычнай зале. Яны прыйшлі займацца гімнастыкай, значыць, ім гэта цікава, раз дзеці вытрымліваюць такую нагрузку, робяць такія складаныя элементы, значыць, нешта імі рухае. Задача старэйшага пакалення дапамагчы дзецям рэалізаваць свае магчымасці, мары. Да таго ж цікава, што будзе далей у беларускай гімнастыцы, бо многія ж кажуць, што яна ўжо не падымецца.

***— Вы з гэтым не згодны?***

— Добрыя дзеці былі, ёсць і заўсёды будуць, ёсць амбіцыйныя маладыя трэнеры, але ім не хапае ведаў. Раней была сістэма збораў, калі ўсе спартыўныя структуры Савецкага Саюза збіраліся ў адным месцы і трэніраваліся разам. Трэнеры маглі вучыцца адзін у аднаго, выбіраць найлепшых спартсменаў, і таму каманда была моцнай. Зараз, каб трэнерам атрымаць вопыт, трэба іх кудысьці адпраўляць, але, па-першае, не заўсёды хтосьці з іншых краін гатовы дзяліцца сваімі сакрэтамі, па-другое, гэта немалыя грошы, а фінансаванне цяпер у нашага віду спорту невялікае, бо спартыўную гімнастыку вывелі са спісу прыярытэтных відаў спорту.

***— Што цяпер уяўляе сабой жаночая зборная Беларусі?***

— Узровень у нас дастаткова нізкі, хоць ёсць нядрэнныя дзяўчынкі. Я ўзначаліў зборную ў сярэдзіне сезона, у спаборніцкі перыяд: калі пачаць нешта перабудоўваць, можна паламаць усё — і сістэму, і тэхніку, а пабудаваць нешта новае за кароткі перыяд немагчыма. Стараюся палепшыць толькі дробныя дэталі, таму вялікага прагрэсу ў найбліжэйшы час чакаць не варта. Дарослая зборная цяпер трымаецца на чатырох дзяўчынках — гэта Анастасія Алістратава, Ганна Траўкова, Жанна Мяцеліца і Аляксандра Вараб'ёва.

Па вялікім рахунку, на ўсю краіну ў нас цяпер адна камбінацыя з чатырох снарадаў — гэта брусы Алістратавай, яна стала з ёй чацвёртай на чэмпіянаце Еўропы, паказаўшы найлепшае выкананне, але ёй не хапіла складанасці. Да Еўрапейскіх гульняў Насця спрабуе дадаць у камбінацыю новы элемент, каб яе ўскладніць.

З 1988 года ў гімнастыцы нічога новага не адбылося, тады складаны скачок, з якім Алена Піскун выйграла чэмпіянат свету, рабіла ўся зборная СССР, а цяпер, у 2019-м, у нас у краіне яго не скача ніхто.

***— Атрымліваецца, вы вырасцілі ў зборнай два пакаленні гімнастак, цяпер працуеце з трэцім. Чым яны адрозніваюцца, чаму тады дзеці маглі рабіць складаныя элементы, а цяпер не?***

— Дзеці нічым не адрозніваюцца, проста трэба знайсці дзяўчынку з псіхалогіяй пераможцы. Гэта можна зразумець па тым, як яна спаборнічае. Гімнастка можа дрэнна трэніравацца, быць траўміраванай, не гатовай, але ў патрэбны момант яна павінна сабрацца і праявіць свае найлепшыя якасці. У зборнай Беларусі за маё жыццё ў гімнастыцы такімі спартсменамі былі Света Багінская і Віталь Шчэрба. Ваня Іванкоў — працаўнік, у яго быў талент, але ён перамагаў за кошт сваёй працы, псіхалогіі не хапала, таму і алімпійскага медаля ў яго няма. Цяпер складана знайсці такіх дзяцей, але трэба шукаць.

Шмат што залежыць і ад трэнера, таму што ў нас усё ж такі дзіцячы від спорту. Няма выніку, значыць, трэнеры не дапрацоўваюць. У кагосьці не хапае ведаў, у кагосьці амбіцый, у кагосьці ўпэўненасці. Я з дзецьмі імкнуся размаўляць на роўных, бо ім жа падыходзіць да снарада і рабіць гэтую складанасць, рызыкаваць. Я не вучу элементам, я вучу дзіця думаць. Каб яны, думаючы, кіравалі сваімі цягліцамі, і тады элемент атрымаецца.

## «Кенгуру сем'ямі прыходзілі на футбольныя палі»

***— Не шкадуеце, што правялі ў Аўстраліі дастаткова працяглы адрэзак жыцця?***

— Ні пра што ў жыцці нельга шкадаваць. Жыццё адно, і трэба радавацца кожнай секундзе. Дзеля чаго чалавек жыве? Сэнс ёсць толькі ў канкрэтнай секундзе.

***— Чаму праз дзевяць гадоў вы прынялі рашэнне вярнуцца ў Беларусь?***

— Было некалькі прычын. У Аўстраліі скончыўся кантракт, прапаноўвалі варыянты застацца, але якраз у канцы 2012 года я прыязджаў у Беларусь на юбілеі мамы і дачкі, размаўляў з начальнікам каманды пра магчымасць зноў узначаліць жаночую зборную, але, як ужо казаў, гэта ўсё засталося на ўзроўні размоў. Сын у Аўстраліі скончыў універсітэт, паехаў у Сідней, я застаўся адзін, а тут дзве дачкі, мама, брат — вялікая сям'я, ды і па прыродзе я дамасед.

***— Менавіта таму і рашэнне пераехаць у Аўстралію далося вам няпроста?***

— Я з'ехаў апошнім з трэнераў, на пераезд падштурхнуў сын. Яму тады было 15, ён любіць усё новае, цікавае, ды і прэстыжна трэніравацца і вучыцца за мяжой. Стас спачатку займаўся гімнастыкай, потым футболам у групе Пышніка, вучыўся ў вучылішчы алімпійскага рэзерву. Калі мы з ім пераехалі ў Аўстралію, ён працягнуў гуляць у футбол, выступаў там за мясцовую каманду ў рэгіянальнай лізе. За паўсезона Стас забіў больш за ўсіх галоў, з часам выйграў чэмпіянат штата, атрымаў прыз самага перспектыўнага маладога гульца. Потым здарылася траўма, ён пачаў трэніраваць дзяцей, яго каманда выйграла чэмпіянат Аўстраліі, праўда, у другой групе.

***— Ваша работа трэнера ў Аўстраліі чымсьці адрознівалася ад работы трэнера ў Беларусі?***

— Калі я прыехаў туды, мне сказалі, што на Захадзе цяпер пакаленне «why» (чаму?). Я кажу вучаніцы, што трэба рабіць так, а яна заўсёды пытаецца: «Чаму я павінна рабіць так?» Але ў мяне заўсёды было такое пакаленне — паўтаруся, я не вучу дзяцей элементам, я вучу іх думаць, і мне без розніцы, аўстралійка гэта ці беларуска. Вядома, ёсць розніца ў менталітэце. У нас слова трэнера — закон, на Усходзе настаўнік — гуру, найвышэйшая інстанцыя, а на Захадзе гэта гувернёр. Высокааплатны, высокакваліфікаваны, але наёмны рабочы. Там камандуюць бацькі і дзіця, а ты павінен яго вучыць, падабаецца табе гэта ці не.

***— Якіх поспехаў дамагаліся вашы аўстралійскія вучаніцы?***

— На чэмпіянаце свету мая выхаванка была сёмай у мнагабор'і. На турніры паміж краінамі ціхаакіянскага рэгіёна, дзе ўдзельнічаюць спартсмены з ЗША, Канады, Японіі, Кітая, Расіі (гэта значыць наймацнейшыя ў спартыўнай гімнастыцы), мая вучаніца Холі Дайкс стала бронзавым прызёрам, а зборная Аўстраліі са мной заняла другое каманднае месца. Дзяўчынка, якая стала сёмай у свеце, за паўгода да Алімпійскіх гульняў сказала, што больш не хоча займацца спортам, — у нас гэта, напэўна, цяжка ўявіць.

Наогул жыццё цікавае, столькі падзей было, сын мне пастаянна кажа: «Сядзь, напішы кнігу». Узяць, напрыклад, наш Бабруйск — залы для спартыўнай гімнастыкі не было, а чэмпіёнка свету Лена Піскун вырасла. Прытым чэмпіёнка ў скачку. Разгонная дарожка для скачка павінна быць 25 метраў, а ў нас яна была 14 метраў. Трэніраваць камбінацыю трэба было два разы на дзень, а калі спартсменцы не хапае разгону, значыць, не хапае інерцыі. Я стаяў і кожны раз яе падштурхоўваў рукамі.

***— Кенгуру на вуліцах Аўстраліі — міф ці рэальнасць?***

— Рэальнасць, вядома. Канбера, дзе я жыў, па плошчы большая за Мінск, а па колькасці насельніцтва прыкладна як Магілёў: горад склалі з некалькіх пасёлкаў. Вакол эўкаліптавыя лясы, кенгуру сем'ямі прыходзілі на футбольныя палі пажаваць траўку.

***— Якія бытавыя моманты вас там больш за ўсё здзівілі?***

— На той момант, пасля дзевяностых, у простага чалавека тут былі вялікія цяжкасці, а там прыехаў — і ў цябе ўсё ёсць. Мне далі добрую зарплату, першы год мы з сынам жылі ў інтэрнаце, потым пачалі здымаць кватэру.

***— Праўда, што вы атрымлівалі там 5 тысяч долараў у месяц?***

— Так, але там гэта не прынята афішаваць. У федэральным цэнтры ў мяне была другая па велічыні зарплата пасля галоўнага трэнера зборнай Аўстраліі.

***— Пасля вяртання ў Беларусь ездзілі ў Аўстралію?***

— Так. Паўтара года таму, на Новы год, і святкаваў там свой юбілей. Нядаўна зайшоў у «Гугл мапс», паглядзеў на тое месца, дзе мы жылі раней, і нешта захацелася ў Канберу. Хоць тут, вядома, весялей — дзве дачкі, чацвёра ўнукаў.

## «У гімнастыцы ўжо роўна 40 гадоў»

***— Вы з'язджалі ў пачатку двухтысячных, вярнуліся праз дзевяць гадоў. Беларусь стала іншай?***

— Вонкава стала еўрапейскай краінай, асабліва ў цэнтрах гарадоў, невялікіх пасёлкаў. Але ў галаве змяніцца значна цяжэй, таму беларусы ідэалізуюць Захад, маўляў, там заробкі вялікія, а кошты як у нас. Але і там, каб годна жыць, людзі працуюць на дзвюх-трох работах. На Захадзе людзям не плацяць, там людзі зарабляюць, а ў нас прывыклі лічыць, што ім павінны плаціць. Усё, вядома, адносна, але беларусам, я лічу, грэх скардзіцца на жыццё.

Што датычыцца спорту, то ён у нас у краіне трымаецца на высокакваліфікаваных энтузіястах. Заўважце, дзе ёсць вынік, там усё будуецца на асобах. Шантаровіч у веславанні, Ляпарская ў мастацкай гімнастыцы. Яны пад сябе збіраюць добры калектыў. На Захадзе такая ж сітуацыя. У Аўстраліі дзяржава не падтрымлівае вялікі спорт, яна падтрымлівае спорт для ўсіх, для здароўя. А прафесійны спорт — гэта ваша асабістая справа, таму там прэміяльныя за «золата» Алімпійскіх гульняў — усяго 10 тысяч долараў. Я калі прыехаў туды, адкрыта сказаў, што не бачу нейкіх стымулаў, рычагоў, каб матываваць спартсменаў. Аказалася, матывацыя для іх — гэта проста з'ездзіць на Алімпіяду. Яны займаюцца спортам проста таму, што ім гэта падабаецца, яны гэта любяць. Там шмат таленавітых дзяцей, але яны свядома не ідуць у элітную гімнастыку, хоць могуць, робяць добрыя элементы, моцныя праграмы, але не хочуць выступаць на чэмпіянаце Аўстраліі па міжнароднай праграме, выступаюць па клубнай у сваё задавальненне. Прыходзяць у залу, трэніруюцца па 3—4 разы на тыдзень, плацяць за гэта грошы — дарэчы, у Аўстраліі нават члены нацыянальнай каманды плацяць грошы за трэніроўкі. Не плацяць толькі ў федэральным цэнтры, дзе я працаваў, там усё за кошт дзяржавы, але такі цэнтр адзін на ўсю краіну. Людзі, якія маюць на мэце высокі вынік, імкнуцца трапіць менавіта туды.

***— Не шкадуеце, што ўсё ваша жыццё прайшло ў фармаце падрыхтоўкі спартсменаў, выхавання чужых дзяцей?***

— Здаецца, я павінен быў быць трэнерам па футболе, усё жыццё на вуліцы ў яго гуляў, гэта першы від спорту, якім я пайшоў займацца. У Аўстраліі, дарэчы, гуляў па выхадных сярод ветэранаў. Неяк адна мая вучаніца спытала, ці памяняў бы я штосьці ў сваім жыцці, калі б была магчымасць. Нашу дзіцячую групу па футболе ў Бабруйску набіраў малады трэнер, праз два месяцы яго забралі ў войска, а нас распусцілі. За гэты час школьны настаўнік фізкультуры пераманіў мяне ў спартыўную гімнастыку. Калі першы настаўнік вярнуўся з войска, хлопцы паклікалі мяне назад у футбол, але мне ўжо няёмка было кідаць гімнастыку. Менавіта гэты момант я б і памяняў, вярнуўся б у футбол. Дарэчы, у гімнастыку я прыйшоў 1 красавіка і ў ёй ужо роўна 40 гадоў.

***— Але трэнерам вы ўсё роўна сталі б?***

— Так, толькі футбольным. Трэнерам не становяцца, трэнерам нараджаюцца.


Дзеці — Стас і Ванеса.

*г. Бабруйск.*

# НЕ МЕНШ, ЧЫМ У БАКУ

### У Нацыянальным алімпійскім камітэце прадставілі беларускую каманду

**На Еўрапейскіх гульнях у Мінску ў складзе нашай каманды выступіць 221 атлет, ім будуць дапамагаць 149 трэнераў, восем чалавек — у адміністрацыйнай групе, сем спецыялістаў — у медыцынскай.**

«Я не стаў бы вылучаць нікога з беларускай каманды, разлічваем на ўсіх. Беларусы будуць выступаць перад роднымі трыбунамі, што павінна матываваць іх, — адзначыў **шэф місіі, першы намеснік міністра спорту і турызму Беларусі Вячаслаў ДУРНОЎ.** — Задача кіраўніком дзяржавы была агучана раней: неабходна заваяваць медаляў не менш, чым на Еўрапейскіх гульнях у Баку: у сталіцы Азербайджана ў скарбонцы беларускай зборнай было 43 узнагароды, 10 з якіх залатыя. Аналіз выступленняў атлетаў за апошнія два гады паказаў, што як мінімум у 10 відах спорту мы маем рэальныя шанцы на поспех. На спартыўным форуме ў Мінску мы будзем клапаціцца і аб якасці ўзнагарод», — сказаў Вячаслаў Дурноў.





Ён падкрэсліў, што канкурэнцыя будзе дастаткова сур'ёзная, у Мінску збяруцца многія вядучыя атлеты. Адказныя задачы стаяць не толькі перад спартсменамі, але і перад медыцынскай групай, Нацыянальным антыдопінгавым агенцтвам. «Падрыхтоўка да Еўрапейскіх гульняў праведзена старанная. У Вёсцы спартсменаў забяспечаны належны кантроль за харчаваннем, гэта ж датычыцца і медыцынскіх прэпаратаў. Калі паўстане неабходнасць прымяніць рэчыва, у якім маюцца забароненыя субстанцыі, то такі прэпарат абавязкова прамаркіраваны, існуе адмысловая працэдура яго прымянення», — адзначыў **дырэктар НАДА Дзяніс МУЖЖУХІН.**

Талісманам беларускай каманды традыцыйна выступіць Агрык, добра знаёмы беларускім атлетам па іншых буйных міжнародных стартах.

Таксама ў НАК прадставілі форму, у якой будуць выступаць беларускія спартсмены. Камплект экіпіроўкі ўключае 18 прадметаў адзення і абутку. Яго распрацоўкай займалася пінскае прадпрыемства. Пры стварэнні калекцыі «Прастора» галоўнай тэмай дызайну стала выкананне з выкарыстаннем стылізацыі традыцыйных арнаментаў і сімвалаў Беларусі. Адным з іх з'яўляецца папараць-кветка. Яна дазваляе найбольш поўна падкрэсліць прыналежнасць да нацыянальнай культуры краіны і яе вытокаў. У аснову каляровага рашэння калекцыі пакладзена спалучэнне кантрасных колераў лагатыпа II Еўрапейскіх гульняў.



Парадна-грамадзянскую форму распрацавала дызайнер Юлія Латушкіна. У аснове дызайну ляжыць ідэя выкарыстання трох колераў — белага, сіняга і шэрага. Галоўным элементам гэтай формы з'яўляецца стылізаваны арнаментальны васілёк, які ўпрыгожвае нацыянальныя ручнікі. Узор выкананы ў стылістыцы народнай творчасці. Форма распрацавана з улікам кліматычных умоў нашай краіны, атлетычных асаблівасцяў фігур спартсменаў і сучасных модных тэндэнцый.

Першыя беларускія атлеты засяляцца ў Вёску спартсменаў ужо ў аўторак, 18 чэрвеня. Наша каманда размесціцца ў новым будынку, атлеты будуць жыць па два чалавекі ў пакоі. «Першымі засяляцца прадстаўнікі баскетбола 3х3, бокса і стральбы з лука, а наогул засяленне беларускіх атлетаў будзе праходзіць паэтапна, — расказаў **намеснік шэфа місіі беларускай дэлегацыі Дзмітрый ДАЎГАЛЁНАК.** — Наша дэлегацыя будзе адной з самых шматлікіх, у Вёсцы таксама будуць размешчаны медыцынская група і штаб дэлегацыі».

Нагадаем спаборніцкая праграма Гульняў стартуе 21 чэрвеня з баскетбола 3х3 і бокса.

**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

# КАНКУРЭНЦЫЯ ПЕРШЫХ НУМАРОЎ

### Як мастацкая гімнастыка будзе прадстаўлена на Еўрапейскіх гульнях у Мінску

**Спаборніцтвы пройдуць 22—23 чэрвеня ў «Мінск-Арэне», у іх возьмуць удзел 52 спартсменкі, яны пазмагаюцца за восем камплектаў узнагарод. На І Еўрапейскіх гульнях у Баку беларускі задалі вельмі высокую планку, тады Меліціна Станюта тройчы ўздымалася на п'едэстал (з пяці відаў праграмы), яшчэ два медалі выйграла каманда ў групавых практыкаваннях.**

На Гульнях у Мінску склад удзельніц будзе крыху ўрэзаны, — так, у індывідуальных спаборніцтвах кожную краіну прадставіць толькі адна спартсменка, у групавых — адна каманда з пяці ўдзельніц (гэта алімпійскі фармат). У індывідуальных практыкаваннях ад Беларусі рыхтуецца выступаць першы нумар зборнай Кацярына Галкіна, запасныя — Анастасія Салас і Арына Гарнасько. У групавых практыкаваннях наша каманда выступіць у складзе Арыны Цыцылінай, Ганны Гайдукевіч, Ганны Швайбы, Карыны Ярмоленкі і Анастасіі Рыбаковай.

**Старшы трэнер зборнай Любоў ЧАРКАШЫНА** адзначае, што ніякіх медальных задач перад нашай камандай не стаіць, але зразумела, што ўсе дзяўчаты будуць спрабаваць паказаць свой максімум. *«У першую чаргу хочацца больш чым годна выступіць пры родных гледачах. Мастацкая гімнастыка зрабіла каласальны крок наперад у плане складанасці — калі вы прыйдзеце на спаборніцтвы, зразумееце, як хутка гімнасткі сталі рабіць больш складаныя элементы, трукі. Таму немагчыма параўноўваць тое, што было на І Еўрапейскіх гульнях, з тым, што будзе цяпер»,* — расказала Любоў Чаркашына.

Таксама яна адзначыла, што, мяркуючы па заяўках, у Мінск прыедуць усе наймацнейшыя гімнасткі. «Дванаццаць спартсменак будуць выступаць у індывідуальных практыкаваннях, сярод іх першыя нумары з Расіі, Украіны, Ізраіля, Малдовы. Плюс восем найлепшых групавых камандаў, абсалютна кожная з іх не проста можа стаяць на п'едэстале — кожная з іх можа выйграць «золата», таму канкурэнцыя будзе вельмі сур'ёзная».

Выступленні мастацкіх гімнастак на «Мінск-Арэне» будуць чаргавацца з акрабатыкай. Любоў Чаркашына адзначыла, што на тэставых спаборніцтвах, якія прайшлі ў маі, яны ўбачылі, як гэта будзе адбывацца. Такі фармат выступленняў не павінен перашкодзіць спартсменкам, да таго ж Кацярына Галкіна, напрыклад, ужо выступала на Еўрапейскіх гульнях у Баку, таму знаёмая з ім.

*«Мінск-Арэна» — шыкоўная пляцоўка, вялікая прастора, дзяўчаты будуць выступаць на памосце, ужо ўсё пратэставана, таму думаю, што ўсё пройдзе добра»,* — дадала старшы трэнер.

**Матэрыялы падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

На адкрытай прасторы

# Манюшка, Дон Жуан і «Адзінота ў сеціве»

## Сёння ўсе дарогі вядуць у Верхні горад

**Толькі-толькі беларускі рэжысёр атрымаў Сярэбранага Лайконіка на Кракаўскім кінафестывалі, як фальклорны персанаж ізноў едзе ў Мінск — сёння ў сталічным Верхнім горадзе з шэсця татарскага вершніка з булавой у руцэ пачнецца чарговы Дзень Польшчы. На працягу дня на фестывалі можна паспець убачыць гэтую прыгожую кракаўскую традыцыю, што вядзецца яшчэ з XIII стагоддзя, паслухаць польскі гурт Golden Life, убачыць выступленне вулічнага тэатра з Кракава «Сцэна калейдаскоп», задаць пытанні знакамітаму пісьменніку Янушу Леону Вішнеўскаму і пасмакаваць ежу па польскіх рэцэптах.**


Гурт Golden Life.

Кажуць, падчас аднаго з татарскіх набегаў захопнікі пацярпелі няўдачу ад жыхароў паселішча Звяжынец пад Кракавам. Тады плытагоны, што кіравалі абаронай, апранулі татарскія строі і пераможнай працэсіяй рушылі ў горад. На чале працэсіі на кані ехаў старэйшы плытагон у касцюме татарскага ваяводы з булавой у руцэ. Гэтае шэсце ў гонар перамогі сталі паўтараць штогод, так яно стала прыгожай кракаўскай традыцыяй з музыкай і танцамі. У Мінску Лайконіка сыграе Збігнеў Глёнэк, што выступае ў гэтай ролі ўжо трыццаць два гады, у яго будзе світа і гурт «Младкоты» з дзевяці музыкантаў. Фальклорнаму персанажу будзе таксама прысвечана вулічная выстаўка.

Верхні горад сёння займее некалькі тэматычных пляцовак, і адной з самых гучных, у прамым і пераносным сэнсе, стане музычная частка фестывалю. Тут зайграюць калектывы польскай дыяспары ў Беларусі, а землякі легендарнага музыканта Чэслава Немена са Шчучына ў гонар яго 80-годдзя выканаюць найлепшыя яго творы.

Вядома ж, фестываль не мог не адзначыць і двухсотгоддзе з дня нараджэння беларускага і польскага кампазітара Станіслава Манюшкі, імем якога Сенатам Польшчы абвешчаны 2019 год. Сімфанічны аркестр Capella Academia, Дзяржаўны камерны хор Беларусі і салісты Вялікага тэатра Беларусі пад кіраўніцтвам дырыжора Аляксея Фралова рыхтуюць адмысловы канцэрт.

Нарэшце, свае найлепшыя хіты выканае польскі гурт Golden Life, за плячыма ў якога 12 альбомаў, аншлагавыя выступленні і саўндтрэкі да польскіх фільмаў.

На тэатральнай пляцоўцы калектыў «Сцэна калейдаскоп», што ў сваіх пастаноўках спалучае цыркавое, балетнае і аўдыёвізуальнае мастацтвы, пакажа спектакль «Сэрца Дон Жуана ў агні» са спецэфектамі і класічнай музыкай.

Аўтар знакамітага, перакладзенага на асноўныя мовы свету рамана «Адзінота ў сеціве» Януш Леон Вішнеўскі стане героем літаратурнай пляцоўкі, адкажа на пытанні і падпіша кнігі.

Таксама на фестывалі адбудуцца выстаўкі «15 год Польшчы ў Еўрасаюзе» і прымеркаваная да Еўрапейскіх гульняў — 2019 «Спорт у польскім плакаце». Дзяцей варта запрасіць на інтэрактыўную гульню ад «Каляровага цырка», а магчымасці па вывучэнні польскай мовы будуць прадстаўлены на моўна-адукацыйным кірмашы.

Усе мерапрыемствы можна наведаць вольна. Арганізатарамі фестывалю сталі Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт, Пасольства Польшчы ў Беларусі і Польскі інстытут у Мінску. Падрабязную праграму можна знайсці на сайце Польскага інстытута www.instpol.by.

**Сафія ПАЛЯНСКАЯ.**

Наталля БАТРАКОВА:

# «ЧЫТАЧЫ ПІШУЦЬ, ШТО МАЕ ГЕРОІ НІБЫТА ПРАЦУЮЦЬ У СУСЕДНІМ ОФІСЕ»



**З Наталляй Батраковай мы сустрэліся на адкрыцці абноўленай кнігарні «Светач», што на сталічным праспекце Пераможцаў, 11. Яна стала першым аўтарам, які зладзіў тут сваю прэзентацыю, пры гэтым адмысловая зала не змясціла ўсіх прыхільнікаў творчасці пісьменніцы. Былі тут і вядомыя беларускія асобы — вядучая Тамара Лісіцкая, спявачка Ірына Відава, пісьменнік Анатоль Бутэвіч і іншыя. Адразу пасля прэзентацыі, у 14 гадзін, адначасова ва ўсіх крамах «Белкнігі» пачаўся продаж новага выдання Наталлі «Бясконцасць кахання, бясконцасць суму...» — заключнай часткі дылогіі «Міг бясконцасці».**

**Прайшло крыху больш за 10 дзён са старту продажаў і... на складзе выдавецтва «Икселент» гэтых кніг больш не засталося: наклад у 4000 экзэмпляраў разышоўся. Ужо рыхтуецца дадатковы тыраж — яшчэ 2000 асобнікаў. Карэспандэнт «Звязды» пагутарыла з вядомай пісьменніцай пра сакрэт поспеху і пра тое, што яна лічыць самым важным у літаратуры.**

**— Спадарыня Наталля, вашы кнігі выдатна прадаюцца ў нашай краіне і за яе межамі, у тым ліку дзякуючы цудоўнаму літаратурнаму стылю. Раскажыце, дзе вучыліся пісьменніцкаму майстэрству?**

— Я прыйшла ў літаратуру без спецыяльнай адукацыі. Але, пэўна, ужо была падрыхтаваная: мела ў галаве гісторыю, якую трэба было толькі выкласці, перанесці ў камп'ютар. Стылю ніхто не навучыць, калі няма хоць бы крышку таленту, уседлівасці і жадання. А далей — пастаянная работа над сабой. Натуральна, мая першая кніга была такім эмацыянальным выплескам. Менавіта з моўнага пункту гледжання і стылістычнага штосьці можна было б удасканаліць — цяпер у плане стылю яна атрымалася б на прыступку ці нават на дзве вышэйшай. З кожнай новай кнігай я таксама вучуся, і гэты працэс бясконцы. А для таго каб пачаць пісаць — няважна, у якім узросце стартаваць (я даволі позна прыйшла ў літаратуру, першы раман выйшаў, калі мне было 38 гадоў), — трэба проста з дзяцінства вельмі шмат чытаць. Чытаць і напрацоўваць базу — і тады ў адзін момант вырашыць, які стыль і якая форма табе больш блізкія. Бо ёсць кароткая, ёсць доўгая форма: гэта як у спорце — ёсць марафонцы, ёсць спрынтары. Напрыклад, у кароткай форме хтосьці можа бліскуча напісаць апавяданне, эсэ, але ў яго не хопіць дыхання на доўгі раман, на гісторыю, якая пішацца гадамі. Як я, напрыклад, ніколі не здолею напісаць выдатную кароткую форму, бо мне ў ёй цесна. І да таго, і да іншага стаўлюся з павагай, але трэба выбраць уласную форму — і працаваць у ёй. Кніга сама па сабе з неба не зваліцца.

> **«Ім казалі, што яны звар'яцелі, ніхто не будзе чытаць невядомага аўтара».**

**— Шмат хто марыць пра ўласнае выданне. Але да справы даходзяць не многія. Успомніце, як вы вырашылі, што ваша кніга павінна з'явіцца?**

— Я села і пачала пісаць. Фантазія мяне прымушала пакутаваць, таму ў адзін цудоўны дзень я пачала выкладаць усё на паперу. На той момант быў надрукаваны першы, самы маленькі, зборнік вершаў (але я ўсё-такі лічу сябе празаікам, а не паэтам). Калі я напісала раздзел новага твора, я прыехала да Святланы Марозавай у выдавецтва «Кавалер» і папрасіла яго пачытаць — паклала ёй у шуфлядку, з надзеяй, што калі-небудзь зверне ўвагу. Янаператэлефанавала праз пару дзён з воклічам станоўчага ўражання і перакананнем, што трэба працягваць пісаць. Як і любому чалавеку, асабліва пачаткоўцу, пачуць такія словы — быццам атрымаць крылы за спінай. Атрымалася так, што адразу з'явіліся людзі, гатовыя надрукаваць мае працы. Яны зрабілі гэта, хоць ім і казалі, маўляў, звар'яцелі, ніхто не будзе чытаць невядомага аўтара. Тым больш у 2001—2002 гадах, калі кніга зазвычай выходзіла без рэкламы, выпускаліся хіба што флаеры. Аднак ёсць вялікая рэч, мацнейшая нават за сацыяльныя сеткі, — гэта сарафаннае радыё. І кніга разышлася, яна прадалася. Для мяне гэта таксама было важна. Я зразумела, што мая справа патрэбна не толькі мне, але і камусьці іншаму. А на сёння шні дзень гэта патрэбна тысячам чытачоў.

**— Раскажыце, як практычна стваралі свае кнігі. Днём працавалі інжынерам у транспартнай кампаніі, а вечарамі пісалі?..**

— Я пісала начамі. Дзесьці з 9-10 гадзін вечара — часам нават даводзілася сябе спыняць. Гэта цікава, калі ты выплёскваеш гісторыю, нашмат больш складана, калі ты, здаецца, яе завяршыў, але вяртаешся назад і пачынаеш перачытваць, дапрацоўваць. Вось тут часам робіцца жудасна: тры аднолькавыя словы на адной старонцы, бачна, калі ў пісанні былі часавыя перапынкі. Бо ў перапынках ты штосьці чытаеш, табе трапляецца кніга акурат з моцнай энергетыкай і стылістыкай, ты неспадзявана як бы ўнутрана пачынаеш штосьці капіраваць — і гэта таксама адчуваецца. У такіх выпадках, калі кімсьці вельмі моцна ўражаны, лепш зрабіць перапынак, а пасля працягнуць сваю працу.

**— На сённяшні дзень пісьменніцтва — гэта ваша асноўная работа, з якой вы жывяце?**

— Так, на мінулай я засталася кансультантам. Вядома, ёсць муж, які працуе. Але сваімі кнігамі на хлеб зарабіць я магу. Хоць беларускі рынак не надта вялікі. Тыражы, распрададзеныя ў Расіі, прынеслі мне нашмат большыя грошы. З галаду я дакладна не памру, і нават мае самыя першыя кнігі перавыдаваліся ўжо не адзін раз.

**— Ці падтрымлівае муж тое, што вы займаецеся літаратурнай творчасцю?**

— Першыя кнігі пабачылі свет толькі дзякуючы яму — гэта далей усё пайшло па накатанай. А напачатку, калі было шмат сумненяў, ён адкрываў рукапіс, вычытваў яго, закрываў і казаў, што трэба друкаваць і што гэта будуць чытаць. Безумоўна, такія словы былі вельмі важныя. Далей, калі я цалкам сышла ў пісьменніцтва, усёй сям'і было няпроста прыстасавацца. Бо калі ты застаешся дома, хатнія просяць зрабіць і тое, і гэтае. Аднак давялося мне іх прывучыць, а ім зразумець і прыняць, што, калі мама засталася дома, то мама не хатняя гаспадыня — яна працуе, піша кнігу. Напачатку быў такі стэрэатып — калі чалавек з'ехаў на работу, то ён працуе, а калі застаўся дома, ён, здаецца, свабодны. Але насамрэч гэта праца і поўнае пагружэнне — я нават выключаю тэлефон і закрываю сацсеткі.

**— Ці сочыце вы за творчасцю сучасных беларускіх аўтараў?**

— Зараз чытаю рукапіс Віталя Радчанкі — можна сказаць, гэта малады аўтар, выходзіць толькі другая яго кніга. Знаёмілася з рукапісам Алены Занкавец — наколькі магу, дапамагаю пачаткоўцам парадай. Таксама чытаю Тамару Лісіцкую, Віктара Марціновіча. Не магу сказаць, што актыўна сачу за творчасцю беларускіх аўтараў, бо калі працуеш над уласным творам, лепш увогуле нікога не чытаць, гэта расканцэнтруе. А ў цэлым пэўныя навінкі я адсочваю. Любімы аўтар з мінулага — Уладзімір Караткевіч. А на сённяшні дзень я жыву па прынцыпе: не ствары сабе куміра. Новыя выданні ацэньваю толькі як чытач. Пэўную кнігу адкрываю — і ўваходжу ў хвалю, я яе разумею і прымаю. А вось іншая кніга — проста не мая, тэма чужая. Хоць гэта не азначае, што праз год яна не падасца мне цікавай — такое бывае.

> **«Стылю ніхто не навучыць, калі няма хоць бы крышку таленту, калі няма ўседлівасці і жадання».**

**— Вы чытаеце, параўноўваеце сябе з іншымі, назіраеце. У чым усё-такі сакрэт вашага поспеху? Можа, штосьці для сябе самой пра сябе вы зразумелі?**

— Я не падладжваюся пад свайго чытача, не заігрываю з ім. І першую кнігу я хутчэй пачынала пісаць для сябе. Бо злавіла сябе на думцы, што чытаю штосьці, а не адчуваю такіх эмоцый, якія, напрыклад, былі ў юнацтве ад кніг «Каралёк — птушка пеўчая» Рэшата Гюнтэкіна, «Спяваючых у цярноўніку» Колін Макалоў, — не чапляе штосьці, няма пэўнай эмоцыі. Таму я пачала пісаць кнігу, каб яна выклікала ў мяне такія эмоцыі. Напэўна, чытачу таксама не хапала душэўнасці ў літаратуры. Да таго ж я рэалістка — я бачу і тое, што адбываецца ў Мінску. Людзям гэта блізка і зразумела. Людзі хочуць чытаць пра сябе. Калі я ствараю такую 3D-прастору, у якой усё адлюстроўваецца, чытачы пішуць, што героі нібы працуюць у суседнім офісе, напэўна, гэта тое, што мяне з імі збліжае.




**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

Падзея

# НЯМЫЯ НОЧЫ

## У Мінску пачаўся самы экстраардынарны кінафестываль краіны

**Мы кожны год пішам пра рамантыку вяртання ў мінулае праз чорна-белае нямое кіно ў суправаджэнні жывой музыкі. Прыйшоў час напісаць і сёлета: 13 чэрвеня ў дворыку музея-майстэрні Заіра Азгура адбыўся першы паказ open-air фестывалю нямога кіно і сучаснай музыкі Кінемо. Кінематограф развіваецца і абяцае новыя формы, а мы тым часам узнаўляем рытуалы пачатку мінулага стагоддзя, і гэта чароўна. Арганізатары — праект Cinemascope і Асацыяцыя маладых беларускіх кампазітараў — падрыхтавалі для публікі пяць вечароў з выключнымі фільмамі ў суправаджэнні адмыслова напісаных кампазіцый.**

Кінемо праходзіць ужо сёмы раз і па традыцыі падае гледачам не проста нямое чорна-белае кіно, а сапраўдную сінефільскую падборку. Кожны год кінааматары могуць убачыць добра вядомыя камедыі ад амерыканскіх комікаў, класіку, без якой нельга ўявіць гісторыю кінематографа, а таксама незаслужана схаваныя скарбы.

Сёлетні фестываль пачаўся з вечара кароткаметражак. Паказ чатырох фільмаў прадэманстраваў, які прагрэсіўны быў кінематограф ужо ў свае першыя дзесяцігоддзі. Авангардныя карціны з Францыі, Германіі і Бельгіі адлюстравалі эксперыменты з формай — змешаную абстракцыю ў агульнавядомым «Механічным балеце», драматызм праз кантраст негатыўных і пазітыўных кадраў у «Баксёрскім паядынку», сюррэалізм «Перадпаўдзённага прывіду» і «Месье Фантамаса». Аўтарамі музычнага суправаджэння сталі Максім Круглы, Вікторыя Спарыш, Алена Гуціна і Вольга Падгайская.

Наступным у праграме стане адзін з трох найвялікшых кінакомікаў Бастар Кітан у фільме «Кінааператар», дзе галоўны герой — як звычайна, нязграбны і няўдачлівы хлопец — намагаецца стаць аўтарам дакументальнага кіно, але правальвае ўсе спробы нешта зняць. Тапёрамі стануць Наталля Котава і Валерый Баравікоў.

На трэцім кінасеансе будзе паказаны малавядомы фільм з нямецкага архіва «Ад світання да паўночы» Карла Хайнца Марціна. «Доўгі час ён лічыўся згубленым, копія была знойдзена толькі ў 1960-х гадах у Японіі, — расказвае праграмны каардынатар фестывалю Вольга Надольская. — Знаходка выклікала сапраўдны бум у прафесійным кіназнаўчым асяроддзі, але ў шырокіх сінефільскіх колах з-за абмежаванай даступнасці не змагла спаборнічаць у папулярнасці з такімі кананічнымі ўзорамі нямецкага экспрэсіянізму, як «Насферату, сімфонія жаху» Фрыдрыха Вільгельма Мурнау альбо «Кабінет доктара Калігары» Роберта Вінэ. Наўрад ці можна спадзявацца на аднаўленне гістарычнай справядлівасці ў адносінах да гэтага фільма, але мы вельмі рады, што ў нас з'явілася магчымасць прадставіць яго мінскім гледачам у суправаджэнні саўндтрэка, напісанага беларускім кампазітарам Аляксандрай Даньшовай, што жыве ў Эсэне».

Наступным у суправаджэнні музыкі польскай кампазітаркі Аляксандры Хмялеўскай Кінемо пакажа антываенную камедыю-гратэск нямецкага і амерыканскага рэжысёра Эрнста Любіча «Горная кошка». «Галоўную ролю ў стужцы выканала адна з зорак нямога кіно Пола Негры, што мае польскія карані. Гэта ледзь не адзіны фільм у кар'еры актрысы, дзе яна паўстала ў нязвыклым для сябе камічным амплуа», — рэкамендуе Вольга. «Горная кошка» трапіла ў праграму дзякуючы ўдзелу Польскага інстытута.

Нарэшце, праз супрацоўніцтва Кінемо з Даўжэнка-цэнтрам фестываль рыхтуе да паказу «зусім невядомую» кінематаграфічную каштоўнасць — «Прыгоды паўрубля» Акселя Лундзіна. «Фільм зняты ў 1929 годзе на кіеўскай студыі ВУФКУ па матывах дзіцячых апавяданняў Уладзіміра Віннічэнкі. Па сутнасці, гэта такія «Дзяніскіны апавяданні», дзеянне якіх адбываецца напярэдадні рэвалюцыі, таму галоўнай тут становіцца праблема сацыяльнай няроўнасці, пры гэтым па ўзроўню паэтычнасці карціна не саступае такім прызнаным шэдэўрам украінскага кіно, як «Зямля» Аляксандра Даўжэнкі і «Вясной» Міхаіла Каўфмана».

Музыку да «Прыгодаў паўрубля» напісала адна з арганізатараў і пастаянных удзельніц Кінемо Вольга Падгайская. Некалькі месяцаў таму яна стала фіналісткай конкурсу кампазітараў Envision Sound, які праводзіцца Даўжэнка-цэнтрам сумесна з Брытанскім саветам ва Украіне. Прэм'ера карціны Акселя Лундзіна з музыкай Вольгі Падгайскай адбудзецца яшчэ да паказу ў Мінску на фестывалі «Німі ночі» ў Кіеве і Адэсе.



Сеансы Кінемо будуць праходзіць у дворыку музея-майстэрні Заіра Азгура кожны чацвер да 11 ліпеня.

**Сафія ПАЛЯНСКАЯ.**



На экранах

# ПРОСТЫ ХЛОПЕЦ ЭЛТАН ДЖОН

## Фільм, дзе навакольная пышнасць адцяняе звычайнасць праблем

**Не паспелі мы адысці ад Рамі Малека ў ролі Фрэдзі Мэрк'юры ў нашумелай карціне «Багемская рапсодыя», як у пракат выйшаў яшчэ адзін баёпік пра музычную зорку — «Рокетмэн» Дэкстара Флетчара, дзе галоўным героем стаў знакаміты кампазітар, спявак, гомасексуаліст сэр Элтан Джон. Праўда, у Расіі і Беларусі фільм выйшаў не без эксцэсаў: расійскі пракатчык «Цэнтрал Партнершып», праз якога кіно трапіла і ў нашы кінатэатры, выпусціў на экран адцэнзураваную версію, без сцэн з сексам і какаінам (хоць здавалася б, чаго мы ў кіно не бачылі). У дыстрыб'ютараў, відаць, свой погляд як на Элтана Джона, так і на цэласнасць мастацкага выказвання.**

Хоць ні нетрадыцыйную арыентацыю спевака, ні прысутнасць у яго днях наркотыкаў прынятыя меры не схавалі — гэтым, як неад'емнай часткай асобы, наскрозь прашыты і біяграфія Элтана Джона, і «Рокетмэн». Фільм нават пачынаецца з таго, што галоўны герой прыходзіць у наркалагічную клініку і прызнаецца ў праблемах з алкаголем, наркотыкамі, траўкай і іншым. Ну і, вядома ж, на працягу ўсёй карціны (як у жыцці) Элтан Джон — адкрыты гомасексуаліст. Ён мае стасункі з мужчынам і прамым тэкстам агучвае сваю арыентацыю. Усё, на шчасце, не выражаш, таму выкіданне асобных кавалкаў становіцца яшчэ больш невытлумачальным.

Параўнаць нашу пакалечаную версію з арыгіналам могуць толькі тыя, што бачылі карціну на Канскім кінафестывалі альбо ў пракаце любой іншай краіны апроч Расіі. З той нагоды, што падобнае свавольства пракатчыка немінуча ўплывае на цэласнасць фільма і зрушвае акцэнты, я б увогуле не раіла ісці на сеанс. Як, шчыра кажучы, і чытаць гэты тэкст, бо ён служыць водгукам на непаўнавартасны варыянт.

Тым не менш кіно — у пракаце, і Элтан Джон (сыграў патаўсцелы Тэран Эджэртан) у ім замілавальны. «Рокетмэн» — тут ёсць пэўныя, у тым ліку драматургічныя, перакрыжаванні з «Багемскай рапсодыяй» — пачынае гісторыю з дзяцінства, якое раскідала па дарослым жыцці спевака сумныя водгаласы. Ад ранніх гадоў да піка сваёй папулярнасці галоўны герой назапашвае крыўды — на абыякавых маці і бацьку, на нявернага палюбоўніка, на найлепшага сябра, што пасля першага канцэрта сышоў з дзяўчынай замест таго, каб раздзяліць шчаслівы момант з Элтанам. Галавакружны поспех і пры гэтым адзінота закальцоўваюцца лячэннем у клініцы — у пачатку карціны галоўны герой агучвае свае праблемы, у канцы, вядома ж, з імі расстаецца і сімвалічна ізноў садзіцца за піяніна.

Праўда, галоўны канфлікт — той самы драматургічны канфлікт — у героя не з бацькамі, не з каханкам і не з сябрам, а з самім сабой. Колькі разоў падчас фільма гучаць пафасныя парады палюбіць сябе, а то ніхто іншы не палюбіць, — не злічыць (тыя ж спробы абвінаваціць ва ўсіх праблемах унутраных дэманаў Мэрк'юры былі ў «Багемскай рапсодыі»; знайшліся і той жа злосны маніпулятар, і сапраўдныя сябры). Элтан Джон такім чынам аказваецца ў палоне ўласных комплексаў, якія вызначаюць яго самаадчуванне, стасункі з навакольнымі і нарэшце прыводзяць да жыццёвага крызісу.

У «Рокетмэне» не так важна ўзыходжанне на музычны Алімп — яно атрымліваецца лёгка і натуральна, будучыя хіты ствараюцца, варта Элтану сесці за інструмент, першы ж канцэрт абарочваецца гучным поспехам і станоўчымі рэцэнзіямі ў прэсе. Талент, удачы, папулярнасць — такія безумоўнасці, ні структура якіх, ні кошт, ні акалічнасці аўтарам фільма не цікавыя. Здольнасці і творчыя дасягненні галоўнага героя — штрых да характарыстыкі, песні і канцэрты — патэнцыял для стварэння маляўнічых і ўражальных сцэн, папулярнасць спевака — умова для глянцавай распрыгожай стылістыкі.

Уласна такім — «дэкарыраваным», расквечаным, пабудаваным на традыцыйных драматургічных кінапрыёмах — «Рокетмэн» і атрымаўся. А на фоне стылістыкі і тых безумоўнасцяў аўтары на першы план выводзяць душэўны неспакой галоўнага героя, то-бок праблему ўнутранага свету, у прынцыпе ўніверсальную, пра знакамітага спевака ідзе гаворка альбо офіснага работніка. Важнасць першага поспеху, канцэртаў, грошай, стасункаў з прадзюсарамі, змен у рабочым графіку намінальная, куды цікавей — згодна з прыярытэтамі карціны — пайсці за псіхалагічнымі складанасцямі Элтана Джона, за яго дзіцячымі траўмамі і ўспрыманнем таго, што адбываецца.

Ну а музыка гэты ўнутраны свет і яго настрой так дарэчна перадае. У пэўным сэнсе сваімі функцыямі асоба галоўнага героя і яго яскравае жыццё раздзяляюцца — дзе галоўны матыў, а дзе дэкарацыя — і Элтан становіцца простым хлопцам, прыкметным тым толькі, што сабраў жалю вышэй галавы і зараз павінен з ім разабрацца.

Расшыты кантэкст — для відовішчнасці, няўпэўненасць у сабе — для канфлікту. І фільм гэтаму кантэксту падтаквае — ён настолькі ж яркі і эмацыянальны, як касцюмы і выступленні Элтана Джона; ён суправаджаецца музыкай таксама насычана, як, можна меркаваць, будні спевака; ён прапануе выдуманыя рэальнасці, якія могуць існаваць толькі ва ўяўленні (і стане наркатычнага ап'янення).

Усе магчымыя колеры наваколля адцяняюць шэрую багну назапашаных крыўдаў галоўнага героя, і гэты кантраст — найпрыгажэйшая частка фільма. Рэтраспекцыя ў мінулае, якая заняла амаль увесь хронаметраж — апавяданне вядзецца ўсё ж з крэсла наркалагічнай клінікі — дазволіла гледачу з песнямі і танцамі прайсці праз жыццё Элтана Джона, а галоўнаму герою прапрацаваць і залячыць свае траўмы.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**

Напярэдадні

# «ЧАКАЕМ ДА 30 ТЫСЯЧ БАЛЕЛЬШЧЫКАЎ»

## Першыя госці Гульняў прайшлі мытны кантроль

**Да старту еўрапейскага спартыўнага форуму застаўся менш чым тыдзень. Неўзабаве ў Беларусь пачнуць прыбываць спартсмены. Балельшчыкі ж сталі ўязджаць у краіну з панядзелка. І першае, што яны бачаць у краіне, —- гэта мытны кантроль.**

— Па апошняй інфармацыі, якой мы валодаем, на Еўрапейскія гульні мяркуецца прыбыццё да 30 тысяч замежных балельшчыкаў, — зазначыў **начальнік галоўнага ўпраўлення арганізацыі мытнага кантролю Дзяржаўнага мытнага камітэта Андрэй БАЛЬШАКОЎ.** — Будуць нагружаны ўчасткі на мяжы з Польшчай і Літвой. Гэта датычыцца аўтамабільных пунктаў пропуску. Але асноўная кропка, куды прыбудуць балельшчыкі і госці Еўрапейскіх гульняў — Нацыянальны аэрапорт Мінск.



Пры падрыхтоўцы мытнікі вывучалі вопыт першых гульняў, якія праходзілі ў Азербайджане. Акрамя таго, браўся пад увагу і досвед працы падчас чэмпіянату свету па хакеі 2014 года.

— Мы зрабілі вельмі вялікі акцэнт на міжнародным супрацоўніцтве, — працягнуў Андрэй Бальшакоў. — Дзяржаўны мытны камітэт заключыў мемарандумы з усімі дзяржавамі, якія мяжуюць з Беларуссю. Дакументы прадугледжваюць арганізацыю ўзаемадзеяння мытных службаў падчас перасячэння балельшчыкамі мяжы. Заадно імі былі вызначаны адказныя асобы на выпадак магчымых няштатных сітуацый.

А вось само праходжанне мяжы мытнікі пастараліся зрабіць як мага зручнейшым. На пунктах пропуску будуць дзейнічаць асобныя калідоры, прызначаныя для гасцей і ўдзельнікаў Гульняў. Ім не давядзецца стаяць у агульнай чарзе. Кіроўцам аўтамабіляў з замежных краін не трэба будзе запаўняць мытныя дэкларацыі. Бальшакоў адзначыў, што яны павінны будуць усяго толькі прад'явіць тэхпашпарт і пасля распісацца ў дэкларацыі. Акрамя таго, можна будзе скарыстацца адзіным інтэрнэт-парталам customs.gov.by і падаць усю неабходную інфармацыю загадзя. Час перасячэння мяжы гэта скароціць вельмі прыкметна.

Усе тавары, якія ўвозяцца для арганізацыі і правядзення Еўрапейскіх гульняў, вызваленыя ад выплаты мытных плацяжоў. У тым ліку і спартыўны рыштунак гульцоў. Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў сумесна з мытняй ужо стварыла анлайн-базу ўдзельнікаў і тых рэчаў, якія яны ўвозяць у Беларусь.

Пункты пропуску прайшлі рэканструкцыю. Напрыклад, «Брузгі» цяпер могуць прымаць да 5900 аўтамабіляў, прытым што ранейшая лічба не перавышала пяці тысяч. У маі Беларусь атрымала ад Кітая ў рамках міжнароднай тэхніка-эканамічнай дапамогі новыя спецсродкі для нагляду на мяжы, якія ўжо выкарыстоўваюцца ў пунктах пропуску. Гэта мабільныя інспекцыйныя комплексы і спецыяльныя інспекцыйна-наглядныя сістэмы, якія выкарыстоўваюць тэхналогію 3D-тамаграфіі. Яны дазваляюць вызначаць, ці ёсць выбуховыя і наркатычныя рэчывы ў багажы. Ускрываць чамаданы і сумкі для гэтага не патрабуецца.

— Мабільны комплекс прызначаны для скарачэння часу правядзення мытнага кантролю, — кажа Андрэй Бальшакоў. — Ён дазваляе пазбавіцца ад фізічнага дагляду, ускрыцця транспартнага сродку і разгрузкі тавару. Агляд транспартнага сродку зойме 10 хвілін, тады як у выпадку фізічнага кантролю працэдура можа расцягнуцца на гадзіны.

Мытнікі таксама атрымалі 39 дэтэктараў наркатычных і выбуховых рэчываў. Дзякуючы гэтаму можна будзе вызначыць наяўнасць іх мікрачасцінак на руках чалавека, ручной паклажы, рулі аўтамабіля і іншых прадметах.

— Мы размеркавалі нашы людскія рэзервы такім чынам, каб менавіта на тых рэйсах, на якіх будуць прылятаць спартсмены і балельшчыкі, максімальна хутка і якасна правесці мытны кантроль, — заявіў **начальнік Мінскай рэгіянальнай мытні Аляксандр ВАЛІЕЎ.** — Значная работа была праведзена Нацыянальным аэрапортам па ўдасканаленні інфраструктуры. Сёння ўзмоцнена праца ўсіх службаў, якія тут працуюць. Спецыфіка такая, што вельмі важна дамагчыся зладжанасці мытнікаў, памежнікаў, службы авіяцыйнай бяспекі. Пэўныя трэніроўкі мы праводзілі. Мы хочам зрабіць праходжанне мытні як мага больш камфортным. Яно не стане менш зручным, чым звычайна. Наадварот, штатная колькасць супрацоўнікаў будзе павялічана.



Але як жа мытнікі пераадолеюць моўны бар'ер?

—- Што да Нацыянальнага аэрапорта Мінск, то 80 працэнтаў супрацоўнікаў вольна валодаюць замежнай мовай. Акрамя таго, ва ўсіх пунктах пропуску павялічана штатная колькасць супрацоўнікаў. Гэта зроблена для таго, каб максімальна скараціць чэргі на мяжы.

Мытнікі таксама паказалі дзейнасць кіналагічнай службы і аналізатара слядоў пораху і наркотыкаў на руках.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота Андрэя САЗОНАВА.**



Так працуе аналізатар слядоў наркотыкаў і пораху.

Сацыяльная ініцыятыва

# АВОСЬКА, ЯКАЯ ДАПАМОЖА ПРЫРОДЗЕ І ЛЮДЗЯМ

**Па сцвярджэнні беларускіх экспертаў, за кошт аднаразовых пакетаў у нашай краіне ўтвараецца да 10 % адходаў пластыку, які не падлягае перапрацоўцы. Як можна знізіць спажыванне аднаразовай ўпакоўкі з поліэтылену і пластыку? Напрыклад, прапанаваць пакупнікам альтэрнатыву — плеценыя гаспадарчыя сумкі-авоські.**

Тым больш што авоська ў апошнія гады ўспрымаецца не як бабулін аксесуар: яна цяпер вельмі папулярная ў Еўропе. Вядучыя еўрапейскія модныя дамы выпускаюць цэлыя калекцыі гаспадарчых сумак. Прычым цана плеценай сумкі пад знакамітым брэндам можа дасягаць некалькіх сотняў долараў.

У Мінску хутка таксама любы ахвотны зможа без праблем купіць модную авоську, прычым па прымальнай цане — каля шасці рублёў. Даступныя плеценыя сумкі з'явяцца ў продажы дзякуючы новаму сацыяльнаму праекту «Добрая авоська», які запусціла «Кока-Кола Беўрыджыз Беларусь» сумесна з грамадскім аб'яднаннем «Беларускае таварыства інвалідаў па зроку».

У гэтага праекта дзве асноўныя мэты — прыцягнуць увагу беларусаў да экалагічных праблем і даць работу людзям з абмежаванымі магчымасцямі.

— Такая авоська заменіць 200 пластыкавых пакетаў штогод, — сцвярджае **намеснік генеральнага дырэктара па сувязях з грамадскасцю Унітарнага прадпрыемства «Кока-Кола Беўрыджыз Беларусь» Марына БАРОЎКА.** — Адначасова, карыстаючыся «добрымі» авоськамі, людзі дапамогуць працаўладкаванню жанчын, якія слаба бачаць, бо менавіта яны іх і будуць плесці.

У праекта, па словах Марыны, свая гісторыя.

— Мы абмяркоўвалі мноства ідэй для вырашэння экалагічных праблем у нашай краіне і ў адной з такіх гарачых дыскусій успомнілі пра авоські, — кажа яна. — Але не проста пра іх, а пра тое, што ў СССР авоські выраблялі людзі, якія мелі праблемы з вачыма. З гэтай, здавалася б, неверагоднай ідэяй мы прыйшлі ў Беларускае таварыства інвалідаў па зроку. І праца закруцілася.

Таварыства знайшло жанчыну з Навагрудка, яна мае праблемы са зрокам і ў савецкія часы працавала на вытворчасці авосек. Яе рукі дагэтуль памятаюць, як гэта робіцца. Гэтая жанчына і спляла першыя некалькі сумак. Зараз яна працаўладкаваная і вучыць плесці іншых.

Адной з задач стала зрабіць авоську, даступную па цане, таму спыніліся на простым базавым дызайне, белым колеры і сярэднім памеры. «Добрая авоська» — добрая і тым, што любы ахвочы зможа на свой густ яе мадыфікаваць.

**❍ Дарэчы**

**Падчас Трынаццатага сезона Social Weekend быў прадстаўлены і праект KrapivkaBy, на аснове якога школьнікі з Мінска хочуць стварыць мануфактуру па вытворчасці крапіўнага валакна, каб потым шыць з яго эка-сумкі. Гэта прынцыпова новы спосаб упакоўкі і захоўвання прадуктаў з дапамогай экалагічна чыстага матэрыялу з крапівы. Таксама добрая альтэрнатыва аднаразовым пакетам.**

Добра гэта ці дрэнна, але сучаснае грамадства так шмат спажывае, што ўпакоўка стала ледзь не галоўным прадуктам жыццядзейнасці чалавека. Тых жа пакетаў з супермаркетаў мы выкарыстоўваем трыльёны кожны год, наносячы незваротную шкоду экасістэме ўсёй планеты. Таму неабыякавыя людзі і сталі шукаць, чым можна замяніць усюдыісны пластык. «Добрая авоська» — адно з такіх рашэнняў.

**Святлана БУСЬКО.**

## ШТО Ў СУСЕДЗЯЎ

### У Літве змагаюцца з пакетамі на заканадаўчым узроўні

Міністэрства аховы навакольнага асяроддзя Літвы прапануе караць гандляроў за бясплатную раздачу аднаразовых поліэтыленавых пакетаў. Адпаведныя папраўкі неўзабаве абмяркуе ўрад.

Парламентам Літвы ў 2016 годзе ўжо былі прынятыя папраўкі, згодна з якімі з 2019 года крамам дазволена выдаваць бясплатна толькі самыя тонкія аднаразовыя поліэтыленавыя пакеты (танчэйшыя за 15 мікрон). Пакеты таўшчынёй 15—50 мікрон з лагатыпамі кампаній бясплатна даваць нельга, таму што такія пакеты складана аддзяліць ад іншага смецця і перапрацоўваюць толькі невялікую іх частку. Акрамя таго, яны доўга раскладаюцца ў прыродзе.

Па звестках Літоўскай асацыяцыі гандлёвых кампаній, у апошнія гады ў Літве сталі выкарыстоўваць менш аднаразовых поліэтыленавых пакетаў. У 2014 годзе на аднаго жыхара прыходзілася 260 вельмі тонкіх і 39 тонкіх пакетаў, а ў 2017 годзе — ужо адпаведна 226 і 34.

Здарэнне

# ШАСЦЁРА АТРЫМАЛІ ТРАЎМЫ Ў ДТЗ

## Сярод пацярпелых чацвёра дзяцей

**У Салігорскім раёне каля чатырох гадзін дня на 122-м кіламетры дарогі Р-55 Бабруйск — Глуск — Любань каля вёскі Пагост жыхарка Слуцка на Renault Megane, рухаючыся збоку горада ў напрамку Любані, здзейсніла ДТЗ.**

Кіроўца, выязджаючы з другараднай дарогі і выконваючы манеўр левага павароту, не саступіла дарогу і здзейсніла лабавое сутыкненне з аўтамашынай МАЗ-650118, якая рухалася злева па галоўнай дарозе.

Па інфармацыі УДАІ УУС Мінскага аблвыканкама, у выніку ДТЗ траўмы атрымала 38-гадовая кіроўца, 39-гадовая пасажырка (грамадзянка РФ), якая сядзела справа ад кіроўцы, а таксама дзеці ва ўзросце дзесяці гадоў (сын кіроўцы), дзевяці гадоў (дачка пасажыра, грамадзянка РФ), васьмі гадоў (дачка пасажыра, грамадзянка РФ), 15 гадоў (пляменнік пасажыра, грамадзянін РФ). З рознымі траўмамі ўсе шасцёра шпіталізаваны ў салігорскую бальніцу. Беларусы пражываюць у Слуцку, расіяне прыехалі з Санкт-Пецярбурга. Кіроўца МАЗа не пацярпеў.

Кіроўцы, а таксама пасажырка Renault, якая знаходзілася на пярэднім сядзенні, былі прышпіленыя рамянямі бяспекі. Дзеці не былі прышпіленыя і знаходзіліся не ў адмысловых утрымлівальных прыстасаваннях. Абодва кіроўцы былі цвярозыя, тэхагляд на абодвух аўто пройдзены.

Дзяржаўтаінспекцыя нагадвае, што падчас спякоты кіроўцы хутчэй стамляюцца, іх увага рассейваецца, а рэакцыя значна пагаршаецца. Невялікая затарможанасць можа стаць прычынай аварыі. Таму за рулём у спякотнае надвор'е варта быць асабліва засяроджанымі і сабранымі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Вёскі, якія знікаюць: апошнія жыхары

# ПРА МАЛІТОЎНІК І БАЦЬКАВЫ ЗАПАВЕТЫ

**Вясневічы Бярозаўскага раёна**




**Галоўная славутасць Вясневічаў, яе жывая гісторыя — 96-гадовы Аляксей Юркевіч. Аляксей Ільіч нарадзіўся ў гэтай вёсцы, тут жылі яго дзед і прадзед. Адсюль у вайну яго з іншымі хлопцамі і дзяўчатамі вывозілі ў Германію. Сюды ён вярнуўся ў 1947 годзе.**

## БАЦЬКАВЫ ГЕНЫ

Чаму можна пазайздросціць, дык гэта памяці Аляксея Ільіча. Здароўе ў такія гады, зразумела, не вельмі. Ходзіць ужо з кіёчкам, голас стаў слабаваты, але слых, зрок, галава — нібы ў маладога. Расказвае ён вельмі цікава, у памяці захоўваюцца эпізоды, дэталі, уражанні 70—80-гадовай даўніны. Відаць, бацькавы гены. З вялікай цеплынёй гэты старэнькі дзядуля згадвае свайго бацьку, успамінае, як той вучыў сына быць спагадлівым да людзей, нікога не крыўдзіць, асабліва жанчыну.

Нарадзіўся адзін з двух апошніх жыхароў Вясневіч у 1923 годзе. У бацькі быў свой кавалак зямлі і гаспадарка. Як і многія беларусы, Ілья Юркевіч некалі выязджаў на заработкі ў Амерыку. Сям'я ў Аляксеевага дзеда была бедная, але сына свайго за блізкі свет ён адпускаць не хацеў. Плакаў, калі ад'язджаў за пазычаныя на білет грошы. Працаваў там сем гадоў. А тут якраз ішлі войны, людзі падаліся ў эвакуацыю, сталі бежанцамі. Вярталіся потым не ўсе. Адзін бацькаў брат асеў у Маскве, другі — у Казахстане. Калі Ілья вярнуўся ў вёску, застаў аднаго толькі бацьку, якому абяцаў вярнуцца, хоць яго і агітавалі застацца за акіянам.

Паслухаўшы параду добрых людзей, ажаніўся з працавітай дзяўчынай Вольгай. Бацька яе ад радасці, што аддаў адну з пяці дачок, дапамог навастечанаму зяцю з насеннем для сяўбы. А зяць купіў кавалак зямлі, каня, карову і адчуў сябе гаспадаром. Аляксей стаў першынцам у бацькавай сям'і, потым адно за адным нарадзіліся шэсць сясцёр і брат.

— Мая Валянціна стала восьмай, калі прыйшла ў нашу сям'ю, — кажа Аляксей Ільіч. — Усе жылі ў адной хаце, і жылі дружна.

## ВАЙНА

Але гэта будзе потым, пасля вайны. А калі ў 41-м прыйшлі немцы, Аляксею споўнілася 18 гадоў. Ужо ў пачатку наступнага года выйшла распараджэнне — ад кожнай сям'і хлопца ці дзяўчыну падрыхтаваць да ад'езду ў Германію. Ён быў старэйшы ў сям'і, яму і выпадала ехаць. Прывезлі іх далёка, аж у Гановер. Працаваць трэба было на жалезных рудніках. «Пастроілі нас у шарэнгу, — успамінае Аляксей Ільіч. — Сталі выбіраць дужых, высокіх. Я адразу ўнутрана сцяўся, прыгнуўся. Мяне абмінулі. Потым стала зразумела: першую партыю адпраўлялі ў шахты. Астатніх пакінулі для работы на паверхні. Мы працавалі на пагрузцы-разгрузцы. Жылі ў лагеры кіламетры за чатыры ад шахты, кожную раніцу немец-ахоўнік вадзіў на работу, увечары гэтак жа адводзіў у барак».

Кожнаму выдалі бірку з асабістым нумарам. У Юркевіча быў нумар 1550. У адпаведнасці з нумарам вялася асабістая справа, змяшчаліся звесткі пра сям'ю, заносіліся заахвочванні і пакаранні, налічвалася, хоць і мізэрная, зарплата.

Далейшы працоўны лёс вырашыла прыродная цікаўнасць беларускага хлопца. Хоць і працаваў на пагрузцы, яго прываблівыў суседні цэх, дзе ўсё бразгала, ляскатала, грымела. І як толькі выпадала свабодная хвіліна, імкнуўся туды зазірнуць. Аднойчы яго цікаўны погляд заўважыў майстар-немец і паклікаў прайсці. Гэта была майстэрня па рамонце ваганетак з мноствам станкоў, механізмаў, прыстасаванняў. Убачыўшы, як у юнака загарэліся вочы, майстар узяў яго да сябе. Аднойчы сказаў: «Алекс, калі вернешся дадому, будзеш майстрам». Потым у жыцці не раз успамінаў Аляксей Ільіч тыя словы, і навука пажылога рамонтніка неаднойчы выручала яго ў жыцці. Несумненна, работа ў цэху была лягчэйшая і больш цікавая, чым перакідванне шуфлем руды.



Там разам працавалі беларусы, рускія, палякі. У 45-м сталі даходзіць чуткі, што фронт блізка. Стары майстар ім пра гэта казаў адкрыта: «Германіі — капут». У той дзень іх на работу не павялі, а чамусьці вывезлі ў лес. Аляксей Ільіч думае, што баяліся, каб працаўнікі-вязні не выступілі супраць гаспадароў, калі пачнецца бой. Гукі бою яны чулі нават са свайго лесу, а потым пачулі іншую мову, не нямецкую. Гэта былі амерыканцы. Яны вельмі прыязна паставіліся да маладых саюзнікаў — раскватаравалі, забяспечылі харчаваннем. Так працягвалася тыдні са два. Потым іх сабралі, сказалі, што прыехалі прадстаўнікі савецкага камандавання. Упершыню яны ўбачылі савецкага афіцэра ў пагонах — на пачатку вайны, як вядома, у Чырвонай Арміі былі пятліцы. Ён прыгожа і ўзнёсла казаў пра тое, як чакаюць юнакоў і дзяўчат на радзіме. Большасць працаўнікоў выказалі жаданне ехаць дадому.

## ДОЎГАЕ ВЯРТАННЕ

Тады амерыканцы раздалі чамаданы, запрасілі ўзяць для родных падарункі. Аляксей набраў кашуль сабе і бацьку, сукенак для жаночай часткі сям'і. А самае каштоўнае — гадзіннік і пярсцёнкі, якія купіў за зарплату, а таксама малітоўнік, які быў з ім увесь час, схаваў у кашалёк.

Калі маладых людзей перавезлі ў зону размяшчэння савецкай часці, чамаданы ў іх забралі. Праўда, Аляксей паспеў апрануць на сябе дзве кашулі — вельмі ж прыгожымі яны падаліся хлопцу, які хадзіў дома ў палатняных уборах. А потым яму і іншым юнакам аб'явілі, што яны прызываюцца ў войска. Тыя фірмовыя кашулі згубіліся на стадыі пераапранання ў ваенную форму. Праз нейкі час навабранцаў прывезлі ў часць пад Віцебскам. Тут у службе нашаму герою дапамаглі ўменні цесляра, а таксама бацькавы ўрокі асабістай гаспадаркі. Вясковага хлопца накіравалі ў падсобную гаспадарку часці. Ён даглядаў кароў. Не змог стрымаць слёз, калі расказваў, як гаравалі нашы людзі адразу пасля вайны. Дамы сталі спаленыя і разбітыя, многія жылі ў зямлянках, галадалі. Дзеці прыходзілі і прасілі: «Салдацік, можа ёсць кавалачак хлеба?» І як радаваўся, калі, падаіўшы карову, даваў мясцовым маладзіцам збанок малака для дзяцей! Так праслужыў наш герой два гады, потым выйшаў загад — 1923 і 1924 гады нараджэння дэмабілізаваць. Трэба было ўздымаць краіну.

## АБЯРЭГ УСЯГО ЖЫЦЦЯ

**Лот № 8.** Изолированное помещение с инв. № 200/D-163108, площадью 37,7 кв. м, Наименование: Административное помещение, Назначение: Административное помещение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/19-16а. Нач. цена: 3839,96 бел. руб. (без НДС). Задаток: 384,00 бел. руб.

**Лот № 9**. Изолированное помещение с инв. № 200/D-163109, площадью 142,3 кв. м, Наименование: Административное помещение, Назначение: Административное помещение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/19-16б. Нач. цена: 14545,22 бел. руб. (без НДС). Задаток: 1454,52 бел. руб.

**Дата, время и место проведения повторного аукциона:** 18.07.2019 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** с 17.06.2019 по 17.07.2019. Срок подписания договора купли-продажи: 20 календарных дней со дня проведения аукциона, оплата объекта производится в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи. Условие аукциона: возмещение затрат по подготовке документации, оплата НДС сверх цены продажи объекта. Изолированные помещения и капитальные строения расположены на земельном участке с кадастровым номером 240100000001002628 (общая долевая аренда). Ранее опубликованное извещение: газета «Звязда» 09.04.2019

**Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30. до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Аукцион проводится в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр.лица, иностранного физ. лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона, возместить затраты по подготовке документации на р/с, указанный в протоколе аукциона, в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. **Задаток перечисляется на р/с ККУП «Витебский областной центр маркетинга» № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566.** Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Доп. информацию можно получить по тел.: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by

---

## РУП «Торговый дом «Восточный» извещает о проведении 17.07.2019 открытого аукциона по продаже недвижимого имущества

Лот № 1. Капитальное строение с инвентарным номером 700/С-73432, общей площадью 113,0 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, пер. Товарный, 8. Назначение: здание специализированное автомобильного транспорта, наименование: гараж № 2. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 740100000002000129 площадью 0,7197 га. **Начальная цена продажи – 11 790,00 рубля, задаток – 1 179,00 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 2. Капитальное строение с инвентарным номером 700/С-90138, общей площадью 100,2 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, пер. Товарный, 8. Назначение: здание специализированное автомобильного транспорта, наименование: контрольно-технический пункт. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 740100000002000129 площадью 0,7197 га. **Начальная цена продажи – 13 500,00 рубля, задаток – 1 350,00 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 3. Капитальное строение с инвентарным номером 700/С-73433, общей площадью 49,7 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, пер. Товарный, 8/1. Назначение: здание специализированное автомобильного транспорта, наименование: гараж № 3. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 740100000002000129 площадью 0,7197 га. **Начальная цена продажи – 4 590,00 рубля, задаток – 459,00 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 4. Капитальное строение с инвентарным номером 700/С-105345, общей площадью 47,6 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, пер. Товарный, 8/2. Назначение: здание специализированное автомобильного транспорта, наименование: гараж. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 740100000002000129 площадью 0,7197 га. **Начальная цена продажи – 4 410,00 рубля, задаток – 441,00 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 5. Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-51426, общей площадью 53,7 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., Бобруйский р-н, Горбацевичский с/с, СТ «Строитель-1» Бобруйского района, 56. Назначение: двухэтажный, сборно-щитовой садовый домик, наименование: садовый домик 56. Составные части и принадлежности: мансарда, веранда, сарай, уборная. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 720883200003000064 площадью 0,0532 га. **Начальная цена продажи – 9 720,00 рубля, задаток – 972,00 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 6. Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-230247, общей площадью 61,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Ландера, 34-105. Назначение: квартира, наименование: квартира 105. **Начальная цена продажи – 77 580,00 рубля, задаток – 7 758,00 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 7. Капитальное строение с инвентарным номером 630/С-73344, общей площадью 20,0 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Чистинский с/с, п. Чисть, ПГК «Чисть-2007», 35. Назначение: здание специализированное автомобильного транспорта, наименование: индивидуальный капитальный гараж. **Начальная цена продажи –1 890,00 рубля, задаток – 189,00 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 8. Земельный участок с кадастровым номером 321880402101000026 площадью 0,2500 га, расположенный по адресу: Гомельская обл., Жлобинский р-н, Верхнеолбянский с/с, д. Нижняя Олба, ул. Ленина, 6А. Назначение-земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома (размещения объектов усадебной застройки).**Начальная цена продажи – 2 647,80 рубля, задаток – 264,78 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 9. Капитальное строение с инвентарным номером 644/С-38902, общей площадью 56,5 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Солигорский р-н, Старобинский с/с, СТ»Дружба-Овины», уч. 41. Назначение: садовый, дачный домик (дача), наименование: садовый, дачный домик (дача). Расположено на земельном участке с кадастровым номером 625000000033000017 площадью 0,0475 га. **Начальная цена продажи – 18 792,00 рубля, задаток – 1 879,20 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 10. Капитальное строение с инвентарным номером 700/С-66172, общей площадью 19,5 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Симонова, гаражно-эксплуатационный кооператив «Симонова» блок № 16, гараж № 41. Назначение: здание специализированное автомобильного транспорта, наименование: здание гаража. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 740100000005003897 площадью 18,0964 га. **Начальная цена продажи – 2 070,00 рубля, задаток – 207,00 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 11. Капитальное строение с инвентарным номером 322/С-18006, общей площадью 28,0 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Рогачев, ул. Карла Либкнехта, д. 65. Назначение: здание специализированное автомобильного транспорта, наименование: одноэтажный кирпичный гараж с подвалом и смотровой ямой. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 324750100001002424 площадью 0,0097 га. **Начальная цена продажи – 5 040,00 рубля, задаток – 504,00 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 12. Изолированное помещение с инвентарным номером 200/D-85329, общей площадью 246,5 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Черняховского, 8. Назначение: магазин непродовольственных товаров, наименование: магазин непродовольственных товаров, расположено на 1-м этаже капитального строения с инвентарным номером 200/С-651. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 240100000003002845 площадью 0,1979 га. **Начальная цена продажи – 417 600,00 рубля, задаток – 41 760,00 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 13. Капитальное строение с инвентарным номером 700/С-12581 общей площадью 78,7 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., Могилевский р-н, М-4, 190-й км, 1. Назначение: здание специализированное для общественного питания, наименование: здание придорожного кафе. Составные части и принадлежности: одноэтажное каменное здание придорожного кафе с асфальтным покрытием, площадкой. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 724484000001000033 площадью 0,1668 га. **Начальная цена продажи – 63 000,00 рубля, задаток – 6 300,00 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 14. Капитальное строение с инвентарным номером 500/С-22715, общей площадью 995,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Социалистическая, 20. Назначение: здание административно-хозяйственное, наименование: административное здание. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 500000000002009001 площадью 4,2144 га. **Начальная цена продажи – 923 400,00 рубля, задаток – 92 340,00 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 15. Капитальное строение с инвентарным номером 700/С-24049, общей площадью 19,2 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., Могилевский р-н, гаражно-эксплуатационный кооператив «Химволокно-2», блок № 6, гараж № 110. Назначение: здание специализированное транспорта, наименование: гараж, составные части и принадлежности: одноэтажный каменный гараж с погребом. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 724400000001000376 площадью 13,8677 га. **Начальная цена продажи – 2 070,00 рубля, задаток – 207,00 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 16. Капитальное строение с инвентарным номером 620/С-24354, общей площадью 89,3 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Дзержинский р-н, г. Дзержинск, ул. Фоминых, д. 52. Назначение: здание специализированное автомобильного транспорта, наименование: здание гаража. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 622250100001000396 площадью 7,3799 га (с правом постоянного пользования). **Начальная цена продажи – 41 310,00 рубля, задаток – 4 131,00 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 17. Капитальное строение с инвентарным номером 431/С-517, общей площадью 55,1 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Кореличский р-н, Малюшичский с/с, д. Скорово, 11. Назначение: здание одноквартирного жилого дома, наименование: одноэтажный деревянный жилой дом. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 423382509601000001 площадью 0,2500 га. **Начальная цена продажи – 1 602,00 рубля, задаток – 160,20 рубля. Шаг аукциона – 5 %**

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае, если заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов) – Претендент на покупку, не позднее 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона на основании счета-фактуры возмещает затраты на организацию и проведение аукциона и оплачивает стоимость приобретенного объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством РБ для победителя аукциона. **Организация и проведение аукциона осуществляется в соответствии с действующим законодательством РБ.**

**Порядок проведения аукциона, в том числе об оформлении участия в аукционе, указан на сайте konfiskat.by в разделе «Недвижимость»**

**Аукцион состоится 17.07.2019 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 27, актовый зал**

**Заявления на участие с приложением необходимых документов, в том числе документа, подтверждающего внесение суммы задатка (задатков) с отметкой банка, принимаются по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 14А, управление реализации недвижимости и арендных отношений в рабочие дни: пн. – чт. – с 08.30 до 13.00, с 14.00 до 17.30, пт. с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 16.15. Окончание приема заявлений 12.07.2019 в 14.00.**

Задаток перечисляется на **р/с BY81POIS30120021178401933001, БИК POISBY2X, ОПЕРУ ОАО «Паритетбанк», 220002 г. Минск, пр-т Независимости, 77, ОКПО 37411910, получатель – РУП «Торговый дом «Восточный», УНП 101127633. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже капитального строения (изолированного помещения), Лот №___, проводимом 17 июля 2019 года.**

**Лот может быть снят с аукциона Организатором по письменному указанию Департамента в любое время до объявления его проданным**

**Контакты организатора аукциона: +375 17 351 00 01; +375 17 380 27 37; +375 44 763 62 63**

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению филиала «Правда-Агро» открытого акционерного общества «Агрокомбинат «Дзержинский» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже **школы-детсада с инв. №620/С-31455 общ. пл. 271,3 кв. м, в состав входит:** (пристройка)**, расположенной на земельном участке с кадастровым номером 622282010101000092 (право аренды по 05.09.2110) площадью 0,3332 га по адресу: Минская область, Дзержинский район, Добриневский с/с, д. Шикотовичи, 17.**

Земельный участок имеет ограничения прав в использовании земель: *водоохранная зона реки Жесть вне прибрежной полосы площадью 0,3332 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) – **32 816,69** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **3 318,00** бел. руб.).

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, г. Минск, БИК в формате IBAN BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **18.07.2019** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **17.07.2019** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

Ведай нашых!

# ТАНЕЦ У ТЭАТРЫ НА МАНХЭТЭНЕ

## Як гродзенка Яўгенія Рамановіч трапіла ў міжнародны праект?

**У Гродне Яўгенія Рамановіч заслужыла рэпутацыю чалавека, які стварае атмасферу ўвагі і павагі да тэатра. Адкрытага. Новага. Смелага! Хуткасцю думкі, унутраным куражом, здольнасцю да грандыёзных праектаў і фантастычных мэт дзяўчына натхняе аднадумцаў, прыцягвае вучняў. І вось цяпер яна танцуе ў тэатры La MaMa на Манхэтане. Карэспандэнт «Звязды» звязалася з Яўгеніяй Рамановіч у разгар прэм'ерных паказаў у Нью-Ёрку. Пагутарылі пра глабальнае і канкрэтнае. Куды ідуць тэатр і сучасны танец? Якія трэнды вядуць рэй? Якая экзотыка ёсць у Гродне ў творчай прасторы «ДОМ46»? Абмеркавалі і вар'яцкія, шалёныя творчыя рытмы Нью-Ёрка.**



### АМЕРЫКАНСКІ ВАЎ-ЭФЕКТ

«Гэта дзівосны горад. У метро сустракаюцца надзвычайныя музыканты, якім бы, здавалася, месца на вялікай сцэне. Але гэта — Нью-Ёрк, варварская канкурэнцыя, — дзеліцца Яўгенія. — Здзіўляе смелая адкрытасць амерыканцаў. Я ехала ў ліфце гасцініцы з незнаёмцам, а ён мне кажа: «Хм... Сёння былі вельмі смачныя булачкі на сняданак». Пажадаць добрага дня прахожаму — лёгка! Іншая атмасфера, іншае грамадства. Маланкавыя хуткасці! Я хадзіла на розныя заняткі ў танцавальныя школы: вулічныя, кантэмпарары, балет. І хачу сказаць: амерыканцы тэхнічныя, хуткія, яны не ведаюць слоў «не магу», «не ўмею».

Для пастаноўкі «Сонца ўзышло — мы тут» сусветна вядомая амерыканская харэограф Калін Томас-Янг прыляцела ў Польшчу. Яна адабрала 10 чалавек: амерыканцы, палякі, украінец і беларуска. Яўгенія Рамановіч цудам даведалася пра кастынг у Любліне. Пасля Беларускай акадэміі мастацтваў дзяўчына працавала ў лялечным тэатры ў Гродне, былі за плячыма польскія і рускія праекты, французкі фестываль. Але вопыт з амерыканскім харэографам — упершыню.

«Сонца ўзышло — мы тут» — кантэмпарары перформанс, гэта значыць, паказвае сучасны танец, імправізацыю, рухі з джаз-танца, ёгі, усходніх адзінаборстваў і многіх іншых кірункаў. Лічыцца, што кантэмпарары нарадзіўся ад мадэрну, які стаў магчымы дзякуючы вольнаму танцу. Заснавальніцай апошняга лічаць Айседору Дункан, якая першая сказала «не» класічнаму балету. І сёння мы маем сучасны танец як асобную свабодную мову цела, здольную перадаць не толькі папсовую любоўную гісторыю, але і глыбокія сур'ёзныя рэчы.

«Усе кантэмпарары перформансы неадназначныя, нельга сказаць: «А работа пра тое». Таму што кожны праз уласны вопыт (якія кнігі чытаў, якія фільмы глядзеў, як разбіраецца ў палітыцы, эканоміцы) будзе чытаць мову цела па-свойму, — кажа Яўгенія. — Для мяне наша пастаноўка — пра стан чалавека. Мы дзелім свет на «паці» (вечарынку), дзе ўсё класна, усе тусуюцца, яркае святло, нам весела, і рэальнасць, дзе многа смецця. Гэта ж ставіла харэограф з ЗША. У іх і праўда брудныя вуліцы, столькі смецця, што нам, беларусам, і не снілася. І ў Калін адчуванне свету праз гэту брудную вуліцу. Мы выкарыстоўвалі крафтавую паперу. Яна валялася ў нас паўсюль, вісела камякамі, ляжала. Свет, дзе разруха, дзе ўсё не так, як табе здаецца або хочацца. І для мяне вечарынка, калі мы ў дзяцінстве бачым усё ў агнях, а далей вырастаем і трапляем у свет рэальны. У нашай пастаноўцы чалавек часта нахілены, не стаіць прама, ляжыць, сядзіць няроўна. Вось гэтае адчуванне нязручнасці, калі цябе ўвесь час ламае *(паўза)*. Для мяне мой сэнс вельмі каштоўны. Бо я доўга не разумела, пра што работа. Аднойчы ў Любліне выйшла пасля рэпетыцыі на вуліцу і ўбачыла бамжа, які сядзеў і спаў на лаўцы менавіта так (!), у нахіленым стане. Я зразумела пра што наша работа! Стан нестабільнасці, нахіленасці. Як ты гэта пражываеш, шукаеш шчасце».

«Як жа вас сустрэў глядач?» — пытаю.

«Рэжысёр адразу сказала, што амерыканскі глядач дасведчаны, любіць тэхніку, ваў-эфект. Каб бах, бах! Моцнае шоу! Так, тут сапраўды поп-культура прафесійная, яркая. Паглядзіце на суперкрутыя канцэрты Мадонны, Б'ёнсэ! І ў сучасным танцы амерыканскі глядач таксама дасведчаны. Мы атрымалі пазітыўныя водгукі на пастаноўку, людзі дзякавалі, гаварылі, як ім цікава, як гэта класна. Раскрываліся палітычныя, эканамічныя штукі. Многія падкрэслівалі дружнасць каманды. Я не бачыла работу збоку, але ўнутры яе было вельмі здорава існаваць, бо я разумела, што і для чаго мы робім, і адчувала ў гэтым місію. Дарэчы, нас запрасілі ў Японію. І *(смяецца)* было б класна выступіць у Беларусі. Рэжысёр пыталася: «Жэня, а гэта рэальна? — усміхаецца Яўгенія Рамановіч і дадае: — Мы хочам прыехаць у Беларусь, але патрэбен арганізатар».

### БЫЦЬ ЦІ НЕ БЫЦЬ?

Беларуску натхняюць рэчы тонкія, ледзь прыкметныя рухі духу. Памятаеце? «Душа павінна працаваць і дзень і ноч, і дзень і ноч». У выпадку Яўгеніі душа любіць сваю працу і гадзіны не лічыць. І для самаразвіцця ў ЗША працуюць суткамі бесперапынна. Калі танцор за гадзіну зарабляе 17 долараў, а гадзіна майстар-класа каштуе 20, то ён не заробіць, каб вучыцца. У гэтым Яўгенія Рамановіч бачыць зваротны бок медаля. Хоць шмат ёсць і бясплатных заняткаў, а тэатр La MaMa вылучае два мільёны долараў штогод на падтрымку маладых артыстаў. У пастаноўках задзейнічаны акцёры, танцоры з сямідзесяці краін свету.

«Ці адметны стыль работы амерыканскага рэжысёра?» — цікаўлюся.

«Я б не казала пра менталітэт. Рэжысёры розныя: адзін табурэтку ў акцёра кіне, а іншы — тактоўны. Але ці то гэта ісціна, ці то маё суб'ектыўнае, але ў заходнім падыходзе няма схемы «кіраўнік — падначалены», мы на роўных. У Беларусі я адчувала трапятанне перад рэжысёрамі. Калін Томас амерыканка і будыстка. А таму работа з ёй для мяне вялікае адкрыццё. Яна нічога не навязвала, мы нараджалі пастаноўку ўсе разам, — кажа Яўгенія. — Праўда, розніца ёсць. Напрыклад, ты зрабіў эцюд. Наш рэжысёр будзе доўга тлумачыць, што было кепска вось тое і тое, і ты будзеш перарабляць гэты эцюд разоў 20. Калін дае — увага! — 1 шанц. Не справіўся? Яна кажа з ветлівай усмешкай «окей» і моўчкі не прымае тваю работу (разводзіць рукамі). Ідэя можа быць класная, але калі яна адразу не страляе, яе не бяруць. Мы ж у Беларусі можам доўга капаць, шукаць адзін жэст гадзінамі... А тут: «Ты не знайшоў жэст? Пфф... Усё! Хто-небудзь іншы зробіць гэты жэст!» З аднаго боку жорстка, з другога — класна, мегацікава, мне падабаецца такі стыль. Аднаго для развіцця трэба пагладзіць, другога — біць *(усміхаецца)*».

Гамлетаўскае пытанне «быць ці не быць» стаіць перад кансерватыўным тэатрам востра. Новы час дыктуе свае ўмовы, і тэатр вымушаны спяшацца. «На оперных фестывалях у Варшаве азіяты спявалі — уявіце! — класічную еўрапейскую музыку. Значыць, цікавасць да яе ў іх ёсць. Але гэта прыватны выпадак. Нельга ўспрымаць асобныя з'явы як трэнд. А вось змяшэнне ўсяго — факт. Так, у Еўропе папулярны кірунак — эксперыментал, калі танцоры, скажам, хіп-хопу разумеюць, што ім цікава не толькі асвойваць тэхнікі, танцаваць пад музыку, але і расказваць гісторыі, шукаць ідэю і канцэпцыю рухаў. І вось гэта ўжо нагадвае тэатр. Цяпер танцор вучыць самыя розныя тэхнікі, і поспех будзе мець той, хто зможа іх граматна злучаць, шукаючы ў гэтым асабістае. І ў ЗША цэніцца індывідуальнасць у любых праявах, — акцэнтуе артыстка. — А яшчэ я заўважыла і такі трэнд: аўдыторыі нецікава проста глядзець танец, яна хоча ўдзельнічаць сама! Танцаваць, спяваць!»

### РОДНЫ КУТ

Танцаваць, спяваць, маляваць вучаць у арт-прасторы «ДОМ46». Яе адкрыла Яўгенія Рамановіч, ускалыхнуўшы творчую атмасферу ў Гродне. «ДОМ46» не проста студыя танца, яго вылучае свая шырокая творчая палітыка і ўласная філасофія мінімалізму. Сучасныя танцы, балет, паэтычныя вечары, музычныя мерапрыемствы, паказы фільмаў, маляванне, лекцыі, сустрэчы ў чорнай і белай залах. Сёння арт-пляцоўка прапаноўвае і экзотыку: бразільскае баявое мастацтва капаэйру, гурджыеўскія рухі, фітнес на батутах. «ДОМ46» — гэта альтэрнатыва для горада, сюды адкрыта дарога людзям смелым, улюбёным у творчасць, каму мала проста тэатра, хочацца перформансу. Такія арт-пляцоўкі частая з'ява ў Маскве, Парыжы, але для Гродна — навінка.

«Я разумею, што вы не той чалавек, які пры цяжкасцях забірае свае цацкі з пясочніцы і ідзе ў іншую... Але, Яўгенія, ці не апускаліся рукі, калі з некаторымі праектамі вы выходзілі ў нуль, а часам у мінус?» — пытаюся.

«На такую арт-пляцоўку трэба чалавек пяць-шэсць, каб падзяліць абавязкі і кожны рабіў сваю справу. Мы ж і вялі заняткі, бухгалтэрыю, арганізоўвалі працэс, займаліся арэндай, мылі падлогу. А вядзенне праектаў — менеджмент. У мяне ў гэтай сферы няма адукацыі, таму ўсё інтуітыўна. Але ёсць вялікае жаданне самой вучыцца і дзяліцца класнымі людзьмі. Напрыклад, пазнаёмілася на фестывалі і бачу, што чалавек валодае ўнікальнымі ведамі, і мне здаецца: «О! Гэта тое, што можа дапамагчы нам у Беларусі!» Запальваюся, запрашаю ў Гродна. Праект заканчваецца, ён сабраў няшмат людзей, але ўсе, хто прыйшоў, атрымалі тое, што хацелі. І я атрымала жаданае, і «ДОМ46», і педагог. І выяўляецца, што мы пайшлі ў мінус. Я заракаюся: больш ніякіх майстар-класаў, але зноў запрашаю», — кажа артыстка.



Яўгенія Рамановіч прызнаецца, што цяпер у Нью-Ёрку вельмі сумуе без «ДОМа46», сваёй роднай прасторы, дзе так цёпла, камфортна. Але, пачынаючы займацца чымсьці новым, зусім не камфортным для сябе, мы моцна пашыраем спектр магчымасцяў, як у геаметрычнай прагрэсіі. Ты ідзеш насустрач выкліку, і прастора адкрываецца табе. Гэта нагадвае эфект снежнага камяка, які расце, а з ім расце колькасць і маштаб магчымасцяў, прапаноў. Толькі пачні.

**Маргарыта САДОЎСКАЯ.**

***Больш фота і відэа глядзіце на сайце.***

---

К@нтыненты

# БРАМА АФРЫКІ

## ШТО АДБЫВАЕЦЦА Ў СУДАНЕ?



**Днямі ўлады Судана прадухілілі спробу дзяржаўнага перавароту, які рыхтавалі ваенныя, звязаныя з колішнім прэзідэнтам краіны Амарам аль-Башырам, сцвярджае тэлеканал Al Arabiya. Падчас падаўлення путчу было затрымана каля 70 чалавек, якія ў асноўным прытрымліваюцца ісламісцкіх поглядаў, перадае тэлеканал. Па звестках СМІ, яны спрабавалі адхіліць ад улады Вышэйшы ваенны савет, які кіруе краінай з красавіка гэтага года. Адметна, што спроба дзяржперавароту адбылася на фоне перагавораў апазіцыі і вайскоўцаў аб кіраванні краінай падчас пераходнага перыяду, пасярэднікам на якіх выступае Эфіопія. Апазіцыя нават заклікала сваіх прыхільнікаў прыпыніць акцыі пратэсту і грамадзянскага непадпарадкавання. Што ж насамрэч адбываецца ў адной з найбуйнейшых краін Афрыкі?**

### НАФТА, ЗОЛАТА, ГУМІАРАБІК

Спачатку трохі «навігацыі». Рэспубліка Судан знаходзіцца ў Паўночна-Усходняй Афрыцы, мяжуе з Егіптам, Эрытрэяй, Эфіопіяй, Паўднёвым Суданам, Цэнтральнаафрыканскай Рэспублікай, Чадам і Лівіяй. На паўночным усходзе абмываецца водамі Чырвонага мора. Гэта адна з найбуйнейшых па плошчы краін Чорнага кантынента (трэцяя пасля Конга і Алжыра) — 1,89 мільёна квадратных кіламетраў. Вучоныя адзначаюць выгаднае геаграфічнае становішча Судана, які многія называюць не інакш як «брамай Афрыкі».



У старажытнасці значную частку гэтых зямель (яны мелі назву Куш, а пазней — Нубія) засялялі семіта-хаміцкія і кушыцкія плямёны, родныя старажытным егіпцянам. Да VII стагоддзя нашай эры Судан уяўляў сабой невялікія разрозненыя хрысціянскія каралеўствы (Алоа, Мукура, Набацыя). З XIV да XVIII стагоддзя на гэтай тэрыторыі існавала некалькі дзяржаў. У пачатку XIX ст. краіна была захоплена Егіптам і як Егіпецкі Судан увайшла ў склад Асманскай імперыі. З другой паловы XIX стагоддзя ўзмацніўся ўплыў англічан. У 1899 годзе Вялікабрытанія і Егіпет падпісалі пагадненне аб усталяванні сумеснага кіравання (англа-егіпецкі кандамініум) — фактычна Судан стаў калоніяй Вялікабрытаніі.

1 студзеня 1956-га Судан быў абвешчаны незалежнай краінай. Паўднёвы Судан (ПС) не пагадзіўся з утварэннем адзінай дзяржавы і пачаў барацьбу за незалежнасць, якая двойчы прымала форму грамадзянскай вайны (у 1955—1972-м і 1983—2005 гадах). 9 студзеня 2005 года ўрадам Судана і прадстаўнікамі паўднёвай паўстанцкай групоўкі было падпісана ўсёабдымнае мірнае пагадненне (УМП). 9 студзеня 2011-га быў праведзены рэферэндум па самавызначэнні Паўднёвага Судана. Па яго выніках ПС быў абвешчаны незалежнай дзяржавай, паколькі больш за 98 працэнтаў удзельнікаў плебісцыту па самавызначэнні рэгіёна прагаласавалі за яго аддзяленне.

У Судане пражывае больш за 40 мільёнаў чалавек (па звестках Сусветнага банка). Дзяржаўнай рэлігіяй краіны з'яўляецца іслам суніцкага кірунку. Кіраўнік дзяржавы — прэзідэнт, з 1989 года гэтую пасаду да нядаўняга часу займаў Амар аль-Башыр. Ён прыйшоў да ўлады ў выніку ваеннага перавароту, завяршыўшы перыяд грамадзянскага праўлення Садыка аль-Махдзі. Армія традыцыйна адыгрывае важную ролю ў палітычным працэсе незалежнага Судана. Да аль-Башыра ваенныя кіравалі краінай двойчы: з 1958-га да 1964-га і з 1969-га да 1985-га.

Па ўзроўні эканамічнага развіцця Судан належыць да групы самых бедных краін свету, хоць мае вялікі патэнцыял для росту. Па дадзеных Сусветнага банка на 2017 год, аб'ём ВУП у бягучых цэнах склаў 117,5 мільярда долараў. Нафтаздабыча, сельгасвытворчасць (у прыватнасці, Судан — сусветны лідар па вытворчасці гуміарабіка, харчовай дабаўкі, якую выкарыстоўваюць для вырабу «Кока-колы», і здабыча золата забяспечваюць каля 70 працэнтаў бюджэтных паступленняў. У сельскай гаспадарцы занята каля 80 працэнтаў насельніцтва. Іншыя сектары эканомікі развіты слаба.

### ТРЫ ДЭВАЛЬВАЦЫІ

Галоўнай перадумовай разгойдвання сітуацыі стала рэзкае абвастрэнне на працягу мінулага года фінансавага крызісу, справакаванага дэфіцытам канверсоўнай валюты, адзначыў на сайце imemo.ru загадчык Цэнтра сацыялагічных і пал餐талагічных даследаванняў Інстытута Афрыкі РАН Сяргей Касцялянец. Гэты дэфіцыт краіна пачала адчуваць яшчэ ў 2011-м, калі ў выніку падзелу Судана на дзве дзяржавы — Рэспубліку Судан (РС) і Рэспубліку Паўднёвы Судан — Хартум застаўся без 60 працэнтаў знешнегандлёвых паступленняў з прычыны страты 3/4 нафтавых радовішчаў. Антыкрызісная эканамічная праграма, накіраваная на фарміраванне новых крыніц даходу, перш за ўсё ад здабычы золата і росту сельскагаспадарчай вытворчасці, а таксама скарачэння імпарту і дзяржаўных расходаў, фактычна праваліліся, у тым ліку з прычыны працягу ваенных дзеянняў супраць паўстанцаў у Дарфуры, штатах Паўднёвы Кардафан і Блакітны Ніл. Значная частка бюджэту РС працягвала расходавацца па артыкулах, звязаных з пытаннямі абароны і нацыянальнай бяспекі.

Акрамя таго, больш за мільярд долараў штогод дзяржава траціць на субсідыі на паліва і муку. Сур'ёзным ударам для эканомікі стала закрыццё летась буйнога нафтаперапрацоўчага завода ў Порт-Судане, адкрытага яшчэ ў 1964-м. Пры гэтым у 2017 годзе суданскі ўрад аднавіў перамовы аб уступленні ў СГА, што пацягнула за сабой лібералізацыю гандлю паводле рэкамендацый МВФ і наступнае значнае павелічэнне імпарту пры нязначным росце экспарту і, адпаведна, новыя праблемы з напаўненнем бюджэту.

Рашэнне ўрада ўключыць друкарскі станок, каб прафінансаваць дэфіцыт бюджэту, прывяло да высокай інфляцыі, якая дасягнула свайго піку (69 працэнтаў у гадавым вылічэнні) у лістападзе мінулага года. Інфляцыя не магла не адбіцца на курсе суданскага фунта. Летась у Судане былі праведзены тры дэвальвацыі нацыянальнай валюты. Курс долара паралельна рос на чорным рынку. Па афіцыйным курсе набыць замежную валюту стала немагчыма. Прыватныя імпарцёры мусілі шукаць «зялёныя» на чорным рынку, што яшчэ мацней раскруціла махавік інфляцыі. Пры гэтым краіна крытычна залежыць ад імпарту прадуктаў харчавання (асабліва пшаніцы — патрэба складае каля двух мільёнаў тон у год), нафтапрадуктаў і лекаў.

### ПАЛІВА І ХЛЕБ

У верасні мінулага года прэзідэнт аль-Башыр распусціў урад і прызначыў на пасаду прэм'ер-міністра Муатаза Мусу, які раней займаў пасаду міністра водных рэсурсаў, ірыгацыі і электрыфікацыі. Новы кіраўнік урада пачаў работу з абяцання звярнуцца да «шокавай тэрапіі для вырашэння праблемы інфляцыі і валютнага курсу». У хуткім часе ён выканаў сваё абяцанне: у кастрычніку ўрад правёў чарговую дэвальвацыю суданскага фунта. У лістападзе ўзляцелі цэны на паліва і тарыфы на транспарт, павялічыліся чэргі на бензакалонках.

Масавыя пратэсты ахапілі Судан у прыканцы мінулага года. Незадаволенасць рэзкім ростам цэн на паліва і хлеб праявілі жыхары горада Атбара на поўначы краіны. Акцыі пратэсту ўмомант падхапілі і ў іншых месцах па ўсім Судане. З тых часоў дэманстрацыі практычна не спыняліся, паступова робячыся ўсё больш арганізаванымі. З часам праграма пратэстоўцаў змянілася: з эканамічнай тэмы яны перайшлі да патрабавання адстаўкі аль-Башыра. 22 лютага кіраўнік дзяржавы абвясціў у краіне надзвычайнае становішча тэрмінам на год, змяніў членаў урада і замяніў вайскоўцамі грамадзянскіх асоб на пасадах губернатараў і іншых пасадах. Аль-Башыр адмовіўся ствараць пераходны ўрад, але ў выніку пагадзіўся застацца на сваёй пасадзе толькі да канца гэтага тэрміну і не ісці на чарговыя выбары ў красавіку 2020-га. Аднак яго абяцанні мітынгоўцаў не задаволілі.

11 красавіка кіраўнік мінабароны Судана Авад бэн Аўф паведаміў пра арышт прэзідэнта Амара аль-Башыра і роспуск кабінета міністраў. У краіне быў створаны часовы ваенны савет, было агучана, што ён будзе кіраваць два гады. Армія прыпыніла дзеянне канстытуцыі і абвясціла пачатак пераходнага перыяду. У Судане былі ўведзены рэжым надзвычайнага становішча і каменданцкая гадзіна. На наступны дзень Авад бэн Аўф сышоў з пасады кіраўніка ваеннага савета. Яго ўзначаліў былы кіраўнік штаба сухапутных войскаў аль-Бурхан. У той жа час апазіцыя заявіла аб працягу пратэстаў.



### ДРУГАЯ ХВАЛЯ

Вайскоўцы і прадстаўнікі апазіцыі на працягу некалькіх тыдняў вялі перамовы аб тым, хто павінен кіраваць у пераходны перыяд. Раней атрымалася дасягнуць прынцыповай дамоўленасці аб стварэнні змяшанага ваенна-грамадзянскага пераходнага ўрада, які павінен прывесці краіну да свабодных выбараў. Па звестках СМІ, апазіцыя настойвала на 8 з 15 месцаў у пераходным савеце, ваенныя ж імкнуліся захаваць большасць за сабой. У выніку суданскі генералітэт адмовіўся ад усіх папярэдніх дамоўленасцяў. Канфрантацыя паміж ваенным кіраўніцтвам і лідарамі апазіцыі падаграваецца падзеямі ў Хартуме. Тут сілавым шляхам быў разагнаны стыхійны палатачны лагер перад Міністэрствам абароны Судана, пасля чаго пачаліся і працягваюцца дагэтуль сутыкненні пратэстоўцаў з паліцыяй. Лік ахвяр беспарадкаў ідзе на дзясяткі.

На мінулым тыдні прыхільнікі аль-Башыра паспрабавалі штурмам узяць турму Кабер у сталіцы краіны, каб вызваліць яго, паведаміў тэлеканал «Аль-Арабія Хадас». Паводле звестак крыніц тэлеканала ў органах бяспекі, звыш 100 чалавек з «атрадаў, верных былому рэжыму» раніцай атакавалі турму Кабер, у якой змяшчаюцца экс-прэзідэнт і яго найбліжэйшае асяроддзе. Суразмоўца СМІ адзначыў, што ахове турмы ўдалося адбіць напад і арыштаваць некаторых удзельнікаў няўдалага штурму.

«Башыр прыйшоў да ўлады ў вельмі цяжкі для Судана час. Тым не менш, ён на працягу 20 гадоў утрымліваў краіну ад распаду і толькі ў апошнія дзесяць гадоў яго рэжым стаў даваць збой, што прывяло да масавай незадаволенасці народа. Цяпер сітуацыя склалася не найлепшым чынам. Увесь гэты час на арэне дзейнічае нейкая трэцяя сіла, нехта, хто выводзіць на вуліцы правакатараў, робіць ілжывыя ўкіды ў заходніх і мясцовых СМІ. Занадта шмат зацікаўленых у расколе і далейшым разграбленні нашай рэспублікі», — апісаў сітуацыю незалежны палітолаг Мадасір аль-Хасын. У сваю чаргу, колішні прэзідэнт Туніса Мансеф Марзукі заявіў у інтэрв'ю РІА «Навіны», што ў Судане цяпер праходзіць другая хваля «арабскай вясны».

Тым часам для ўрэгулявання канфлікту паміж ваеннымі ўладамі і апазіцыяй у Судан прыбыў высокапастаўлены дыпламат з ЗША — памочнік дзяржсакратара па Афрыцы Тыбор Нагі, паведамляе Reuters. Адзначаецца, што дыпламат сустрэўся з лідарамі апазіцыйнай кааліцыі, а таксама правёў перагаворы з выканаўцам абавязкаў намесніка міністра замежных спраў Судана Ільхамам Ібрагімам. Разам з тым Злучаныя Штаты прызначылі сваім паслом у Судане ветэрана дыпламатыі Дональда Бута.

Папа Рымскі Францыск у сваёй нядзельнай пропаведзі да вернікаў, якія сабраліся на плошчы Святога Пятра ў Ватыкане, згадаў сітуацыю ў Судане. «Боль і заклапочанасць выклікаюць весткі, якія прыходзяць у гэтыя дні з Судана. Памолімся за гэты народ, каб спыніўся гвалт і было знойдзена агульнае дабро ў дыялогу», — заявіў пантыфік.

**Захар БУРАК.**

Нашы людзі на «Славянскім базары»

# ПЕРФЕКЦЫЯНІСТ ВАНЯ ЗДАНЮК

**...Эстрадныя конкурсы — рэч непрадказальная, завязаная не толькі на таленце, але і на ўдачы. Аднаму артысту, каб пацвердзіць сваю «самасць», трэба шмат гадоў дабівацца мэты, а іншы бярэ Алімп імклівым штурмам. Трэцякурснік Універсітэта культуры мінчанін Ваня Зданюк, падобна на тое, з ліку апошніх. Ваня ўпершыню падаў заяўку на нацыянальны адбор «Славянскага базару ў Віцебску» — і адразу выйграў. Усё аказалася дарэчы: назапашаны вопыт удзелу ў некалькіх музычных шоу і міжнародных конкурсах, адметная манера спеваў, сучасны рэпертуар і яркая харызма, гэткая сумесь абаяння і дзёрзкасці. І хоць перавага склала ўсяго адзін бал — відаць, гэта празрысты намёк лёсу, што шанц трэба скарыстаць напоўніцу?**



Насамрэч так маладому артысту шанцуе не ўпершыню. Некалькі гадоў таму падчас навучання ў расійскай Акадэміі эстраднай музыкі Ігара Крутога ён трапіў у дзясятку шчаслiўцаў (са 130 вучняў), каго ўзяў на свае майстар-класы знакаміты педагог па вакале Дэвід Лі Бруэр, вядомы па рабоце са спявачкай Б'ёнс. А цяпер — і сам Ваня пагаджаецца, што гэта вялікая ўдача — ён рыхтуецца прадставіць нашу краіну на конкурсе маладых выканаўцаў «Віцебск-2019» з камандай прадзюсарскага цэнтра «Спамаш», дзе акумуляваны не толькі моцныя творчыя сілы, але і самая сучасная ў краіне гуказапісная тэхніка.

Нават у напружаным графіку ў яго знаходзіцца час на іншыя важныя справы — сесію (днямі здаў на «выдатна» першы экзамен) ці, напрыклад, удзел у патрыятычнай акцыі «Беларусь памятае». «Я вельмі ганаруся, што стаў часткай гэтай акцыі — расказаў пра свайго прадзеда Бачылу Васіля Нікіфаравіча: ён удзельнічаў у партызанскім руху Беларусі, быў у атрадзе імя Юрчанкі (1-я Мінская брыгада)», — паказвае Ваня фотаздымак.

**— Да «Славянскага базару» застаўся ўсяго месяц, а ты раптам памяняў адну з конкурсных песень. Чаму?**

— Справа ў тым, што ў мінулыя гады канкурсанты выконвалі тры песні: адна — можна сказаць, для знаёмства з членамі журы, а дзве другія — непасрэдна на конкурсе, пад фанаграму «мінус 1» і ў суправаджэнні аркестра. Аднак сёлета правілы памяняліся, і гэту азнаямляльную песню выключылі. Таму нам давялося пісаць новую. Яе аўтар — кампазітар і спявак Uzari, песня называецца «Кучаравая», і вы правільна разумееце, яна па матывах вядомай кампазіцыі ансамбля «Беларускія песняры» «Бялявая, чарнявая», нават утрымлівае цытаты. Гэта песня пра дастаткова самаўпэўненага хлопца, які шукае дзяўчыну, тую самую, з якой яму было б камфортна. А ці знаходзіць? Пра гэта і расказваецца ў песні.

**— За другую конкурсную песню, «Natural» ад Imagine Dragons, хачу асабіста табе падзякаваць — здаецца, нашаму правільнаму і часам занадта акадэмічнаму «Славянскаму базару» не хапала драйву, пэўнай чартаўшчынкі. Яна частка твайго сцэнічнага вобраза ці свая, прыроджаная?**

— Дзякуй на добрым слове. Я таксама, калі ехаў у Оршу на фінал нацыянальнага адбору, хацеў паламаць пэўныя стэрэатыпы «Славянскага базару», і вельмі рады, што журы і гледачы падтрымалі выбар. А песня — гэта не маска, яна насамрэч можа мяне ахарактарызаваць. Я даволі спакойны чалавек, але ўнутры ёсць стрыжань, які дапамагае не зламацца, а ў пэўны час і «выбухнуць» на сцэне альбо ў жыцці.

**— Цябе прадстаўляюць не толькі як спевака, але і як аўтара песень. Ці шмат уласных твораў у рэпертуары?**

— Нядаўна якраз напісаў песню, з якой, магчыма, паспрабую ўдзельнічаць у адборы на «Еўрабачанне». Яшчэ некалькі дапрацоўваю. Спадзяюся, да канца гэтага года прадстаўлю іх слухачам, як і абяцаў.

**— Ты часта згадваў, што ўдзячны бацькам, якія падтрымалі рашэнне стаць артыстам. А хто будзе падтрымліваць цябе на «Славянскім базары»?**

— Натуральна, вялікая каманда прадзюсарскага цэнтра «Спамаш» — і наша дырэктар Анжэліна Мікульская, і прадзюсар Леанід Шырын, і кіраўнік прадзюсарскай студыі цэнтра Кацярына Блізнец, і прэс-сакратар Іван Прус — усе-ўсе, хто задзейнічаны ў падрыхтоўцы да конкурсу. Гэта насамрэч дарагога каштуе, калі ты ведаеш, што за спінай — каманда, што цябе не кінуць сам-насам з любой праблемай, а, наадварот, створаць усе ўмовы для работы. Я не стамлюся паўтараць, наколькі ўдзячны за такую падтрымку. І, вядома, мае сябры і сям'я, без якіх наогул нічога не атрымалася б, хто навучыў не здавацца, перажываць расчараванні і няўдачы і зноў ісці наперад.

**— Уяві сабе: конкурс скончыўся, ты прачынаешся пасля закрыцця «Славянскага базару» і... якое першае жаданне?**

— Цікавае пытанне, — задумваецца Ваня. — Мяркую, незалежна нават ад таго, якім будзе вынік, я збяру разам каманду, якая ўдзельнічала ў падрыхтоўцы, сваіх блізкіх. Куплю торцікі і падзякую ўсім, хто на працягу ўсяго шляху быў побач, дапамагаў і даваў магчымасць знаёміцца з новымі гледачамі.

**— То-бок адпачынку гэтым летам не плануецца?**

— Не. Хоць, вядома, вельмі хочацца дзе-небудзь у жніўні зладзіць сабе «перазагрузку», і пабыць хоць дзён пяць на моры. Але пакуль што расслабляцца рана.

# УСМЕШКА, ЦЫМБАЛЫ І РОК-Н-РОЛ КСЮШЫ ГАЛЕЦКАЙ



**У сям'і Галецкіх чацвёра дзяцей: старэйшыя Вова і Маша, Ксюша і зусім маленькі Арсеній. Але менавіта Ксюша такая няўрымслівая і энергічная, што спявае, танцуе, вывучае некалькі замежных моў, вядзе тэлеперадачу — і ва ўсім дасягае поспехаў. Не дзіўна, што сёлета менавіта яна прадставіць Беларусь на дзіцячым конкурсе «Славянскага базару ў Віцебску». На падліку перамог, якія дзяўчынка за свае 11 гадоў атрымала на шматлікіх музычных конкурсах, мы збіліся і кінулі гэты дарэмны занятак. Затое падрыхтавалі для Ксюшы «матэматычныя» пытанні, у кожным з якіх — пэўная лічба пра яе.**

**— Помніш песню, з якой першы раз выйшла на вялікую сцэну?**

— Так, гэта была «О-а-о» Ксеніі Сітнік, я выступала з ёй на адборы тэлеконкурсу «Я спяваю»...

**— ...І ў сем гадоў стала ўдзельніцай пятага сезона праекта. Чым наогул запомніўся табе гэты конкурс, акрамя таго, што пастаянна даводзілася ездзіць на заняткі з педагогамі з Гомеля ў Мінск?**

— Па-першае, я пасябравала з многімі таленавітымі дзецьмі, з якімі і цяпер мы сустракаемся на канцэртах. Па-другое, безумоўна, сцэнічны вопыт — раней я ніколі не выступала на такой вялікай пляцоўцы (Палац Рэспублікі. — ***Аўт.***), а пасля гэтага дэбюту дзякуючы працы з вопытнымі педагогамі многаму навучылася і ўжо не баялася. Атрымаўся такі маленькі стартап, пасля якога я ўжо занялася музыкай усур'ёз.

У 2015-м пасля тэлеконкурсу «Я спяваю» Ксюша разам з іншымі фіналістамі выступала ў гарадах Беларусі і Славакіі, потым прывезла некалькі Гран-пры, у тым ліку з Масквы і Кіева. А летась Галецкія пераехалі з Гомеля ў Мінск, дзе Ксюша займаецца ў студыі мастацтваў Malinovka by Spamash прадзюсарскага цэнтра «Спамаш» і шмат выступае.

**— Песню «Грай» аўтарства Анастасіі Марчук ты будзеш выконваць 8 ліпеня ў фармаце «плюс 1», то-бок удзвюх з Насцяй Ванеевай, цымбалісткай са Смаргоні, якая ў шоу «Лепш за ўсіх» вучыла Максіма Галкіна, што наша краіна правільна называецца Беларусь.**

— Запрасіць Насцю — гэта была ідэя дырэктара прадзюсарскага цэнтра «Спамаш» Анжэліны Уладзіміраўны Мікульскай. Мы сустрэліся і, хоць раней бачылі адна адну толькі па тэлевізары, хутка «сыграліся», нам вельмі камфортна выступаць разам. Магчыма, я справілася б і ў адзіночку, але разам з Насцяй нашмат лягчэй, падтрымка на сцэне — гэта вельмі важна.

**— Зараз назаву страшную лічбу: другая твая конкурсная песня, «Back in the USSR», напісаная ў 1968-м. Яна старэйшая за цябе практычна на 40 гадоў! Нечаканы выбар для дзяўчынкі, якая ведае СССР у лепшым выпадку па расказах бацькоў...**

— Калі мы з мамай і педагогам шукалі песню для конкурсу, то пачулі гэты твор, але не ў той версіі, якую спявалі The Beatles, а ў арыгінальнай аранжыроўцы, у якой ёсць дзе паказаць голас. Вырашылі спыніцца менавіта на гэтым варыянце.

Ксюша са смехам прыгадвае, як шукала з мамай адпаведны песні касцюм — усё падабралі, акрамя абутку. Літаральна ў апошні дзень перад канцэртам знайшліся ў краме стыльныя боцікі, але... 38-га памеру. І дзяўчынка са сваім папялушкіным 35-м, зашнураваўшы і зашпіліўшы абутак, дзе толькі можна, зрабіла ўсё, каб гледачы ні пра што не здагадаліся. Вось што значыць артыстка!

**— У апошнія два гады ты не толькі спявачка, але і тэлевядучая на канале «Беларусь 4. Гомель». Пра што расказваеш у перадачы «Класны час»?**

— Гэта пазнавальна-забаўляльная перадача для падлеткаў, у якой расказваем розныя навіны пра жыццё, школу, захапленні, праводзім эксперыменты, таксама гутарым з цікавымі гасцямі.

**— Пасля пераезду з Гомеля ў Мінск ты паступіла ў лінгвістычную гімназію і цяпер вывучаеш ажно тры замежныя мовы: англійскую, французскую і кітайскую. На якой больш падабаецца спяваць?**

— Спявала ўрывак нават на кітайскай, — усміхаецца Ксюша, — але гэта вельмі складаная мова, трэба вывучыць усе іерогліфы, як яны правільна пішуцца, у якім парадку ставіць кожную палачку і закаручку, зверху ўніз ці наадварот... У вывучэнні якраз дапамагае музыка, бо ў кітайскай значэнне слоў змяняецца ў залежнасці ад інтанацыі. На французскай таксама выконвала кампазіцыю Лары Фабіян «Je suis malade», вельмі падабаецца гэта песня. А англійская мова — наогул самы любімы школьны прадмет, мне цікава і вучыць яе, і спяваць на ёй.

**— Неўзабаве пасля «Славянскага базару» ў цябе будзе дзень нараджэння. Якi найлепшы падарунак на 12-годдзе?**

— Найлепшы, бясспрэчна, перамога ў конкурсе, але гэта трэба зрабіць самой. А ад іншых... Не ведаю нават, у мяне ўсё ёсць, нават што датычыцца дробязяў.

**— Тады ўдачы табе на сцэне і падары сабе і нам добры настрой!**

### З першых вуснаў

— Што мяне радуе — Беларусь сёлета прадстаўляюць вельмі юныя, але вельмі сучасныя артысты, якія нясуць культуру цяперашняга дня, — адзначае **дырэктар прадзюсарскага цэнтра» Спамаш» Анжэліна МІКУЛЬСКАЯ.** — Акрамя вакальнага таленту і артыстычных здольнасцяў, яны надзвычай працавітыя, гатовыя бясконца ўдасканальвацца дзеля выніку, дадаткова займацца, рэпеціраваць. Часам нават даводзіцца прытрымліваць іхні імпэт, каб паберагчы звязкі. А яшчэ ў іх ёсць вельмі душэўнае, добразычлівае стаўленне да публікі, удзячнасць за дапамогу і добрае слова, любоў да радзімы і сур'ёзнае разуменне таго, што яны прадстаўляюць сваю краіну. Гэта ўсё вельмі важныя якасці, бо дзякуючы ім Ксюша і Ваня — не «прадзюсарскі праект», не штучна прыдуманыя артысты, а сапраўдныя, такія, як яны ёсць. І, безумоўна, наша задача як прадзюсарскага цэнтра — паказаць гэтую сапраўднасць у самым выйгрышным святле, каб яны выступілі пераможна.

Як пяецца ў адной добрай песні, што тут дадаць — хіба што нічога. Няхай задуманае спраўдзіцца і беларускія канкурсанты атрымаюць свае «Ліры», а слухачы — новых яркіх артыстаў. Сваіх!

**Гутарыла Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**


**Коммунальное унитарное предприятие «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»**
**17 июля 2019 г. проводит открытый повторный аукцион с условиями № 06-У-19 на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений)**

**Вид аукциона:** открытый (на повышение начальной цены).
**Предмет аукциона:** право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на предоставляемом земельном участке, на котором находятся объекты, подлежащие сносу.
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.
На торги выставляется право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на пяти земельных участках в г. Минске, предоставляемых в аренду сроком на 5 лет:

| № предмета аукциона | Месторасположение земельного участка | Площадь земельного участка, га | Целевое назначение земельного участка | Начальная цена предмета аукциона, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, руб. | Наличие обременений | Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельного участка и сносом расположенных на нем объектов недвижимости |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1 | г. Минск, в границах ул. Восточная – ул. Кольцова – пер. 4-й Полиграфический | 1,0719 | Для строительства объекта «Жилая многоквартирная застройка в границах ул. Восточная – ул. Кольцова – пер. 4-й Полиграфический» | 367 547,81 | 55 000,00 | 31 649,87 | Отселение и снос попадающих под пятно застройки жилых и нежилых строений по ул. Восточной, д. 184, 186, 188, 190; по пер. 4-му Полиграфическому, 10, 16, 16А, 18 | 5 385 698,55 |
| 2 | г. Минск, ул. Вышелесского – ул. Скрипникова | 1,5902 | Для строительства объекта «Многофункциональный административно-деловой и торгово-развлекательный комплекс с паркингом на 300 машиномест ул. Вышелесского – ул. Скрипникова в г. Минске» | 497 345,07 | 70 000,00 | 9 930,67 | Отселение и снос жилых и нежилых строений по ул. Академика Вышелесского, 20, кв. 1, ул. Академика Вышелесского, 20, кв. 2, ул. Академика Вышелесского, 22 | 964 466,73 руб., в том числе 449 230,32 руб. – кадастровая стоимость земельного участка по ул. Вышелесского, 20. Возмещение потерь сельскохозяйственного производства в размере 16 289,82 руб.* |
| 3 | г. Минск, ул. Проектируемая № 4 в бывшей дер. Сухарево (№ 9 по генплану м-на № 1) | 0,3462 | Для строительства объекта «Торговый объект по ул. Проектируемой № 4 в бывшей дер. Сухарево (№ 9 по генплану м-на № 1) в г. Минске» | 80 239,12 | 12 000, 00 | 9 757,87 | Отселение и снос жилых и нежилых строений по ул. Школьной, 7 и 9 | 574 756, 65 руб., в том числе 150 964,11 руб. – кадастровая стоимость земельного участка по ул. Школьной, 7. Возмещение потерь сельскохозяйственного производства в размере 3 120,85 руб.* |
| 4 | г. Минск, пер. Ольшевского | 0,3286 | Для строительства объекта: «Объект производственного назначения по пер. Ольшевского в производственной зоне 18ПЗ в г. Минске» | 76 220,84 | 11 000,00 | 11 192,44 | Снос зданий и сооружений по ул. Бирюзова, 12А, попадающих под пятно застройки | 181 107,36 руб. |
| 5 | г. Минск, ул. Щетовка | 0,7404 | Для строительства объекта: «Объект общественного питания с павильонами и площадками для отдыха и пикников по ул. Щетовка в г. Минске» | 216 044,35 | 32 000,00 | 11 754,40 | Снос строений и сооружений по ул. Щетовка, 8, 10, попадающих под пятно застройки. Снос и отселение собственников дома по ул. Щетовка, 14 | 156 770, 00 руб., а также возмещение в бюджет г. Минска затрат, связанных с выполненным отселением граждан по ул. Щетовка, 8, 10. Возмещение потерь сельскохозяйственного производства в размере 11 418,23 руб.* |

* Потери сельскохозяйственного производства подлежат пересчету, а также актуализации с учетом нормативов, действующих на дату их фактического возмещения и соответствующего уровня инфляции.

Возмещение убытков и потерь сельскохозяйственного производства производится лицами, которым предоставляются изымаемые земельные участки.

Основные требования по проектированию и строительству объекта и условия предоставления земельного участка указаны в земельно-кадастровой и иной документации, подготовленной для проведения аукциона.

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках и их характеристики содержатся на планово-картографических материалах в составе земельно-кадастровой документации.

Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).

Аукцион состоится **17 июля 2019 года в 16.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Участниками аукциона могут быть юридические лица или индивидуальные предприниматели. В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников – двух и более индивидуальных предпринимателей, юридических лиц.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**внести задаток не позднее 11 июля 2019 г.** в размере, указанном в графе 6 таблицы, перечисляемый на расчетный счет № BY18AKBB36410000000160000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBB BY 2X, УНП – 100690830, назначение платежа – 04002, получатель – главное финансовое управление Мингорисполкома;

представить в коммунальное унитарное предприятие "Минский городской центр недвижимости" (организатору аукциона) следующие документы:

заявление на участие в аукционе;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка, с отметкой банка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

дополнительно представляется:

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.

При подаче документов на участие в аукционе представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

При подаче документов уполномоченное лицо, которое будет представлять на аукционе стороны договора о совместном участии в аукционе и подписывать протокол о результатах аукциона (его представитель), предъявляет документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями, юридическими лицами, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия должностного лица.

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу:

г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6, по 11 июля 2019 г. включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00 (по пятницам до 16.45).

Торги в отношении земельных участков проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, аукцион признается несостоявшимся и земельный участок предоставляется такому лицу при его согласии с внесением платы за право заключения договора аренды земельного участка в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона** в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан:

– внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления Минским горисполкомом рассрочки ее внесения);

– возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

– возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. **Информация о затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона при заключительной регистрации под роспись.**

** - единственный участник несостоявшегося аукциона также в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения об изъятии и предоставлении земельного участка обязан выполнить условия, предусмотренные в указанном решении, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка.

Оплата стоимости за право заключения договора аренды земельного участка осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. По заявлению победителя аукциона либо единственного участника несостоявшегося аукциона Минский горисполком предоставляет рассрочку внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка.

После внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления Минским горисполкомом рассрочки ее внесения) Минский горисполком заключает с победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона договор на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений).

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной и градостроительной документацией по земельным участкам (в том числе с характеристиками расположенных на земельных участках инженерных коммуникаций и сооружений (при их наличии) и условиями инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории). Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

**Контактный телефон + 375 (17) 226-16-72, официальный сайт организатора аукциона: www.mgcn.by**



**Дещенский сельский исполнительный комитет Узденского района Минской области 18 июля 2019 года по адресу аг. Дещенка, ул. Школьная, 5А, кабинет председателя (2-й этаж, кабинет № 1) в 10.00 проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов**

| № лота | Продавец | Местонахождение участка | S (га) | Кадастровый номер | Начальная цена, руб. | Расходы по подготовке, руб. | Примечание |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| № 1 | Дещенский сельисполком | д. Алеховка, ул. Центральная, уч. 22Б | 0,2500 | 625683400101000033 | 6 500,00 | 73,50+ расходы на публикацию | Имеется возможность подключения к водоснабжению, электроснабжению, газоснабжению |
| № 2 | Дещенский сельисполком | д. Володьки, ул. Рябиновая, уч. 1А | 0,1499 | 625680202201000301 | 9000,00 | 1365, 00+ расходы на публикацию | Имеется возможность подключения к водоснабжению, электроснабжению, газоснабжению **проектирование объектов транспортной инфраструктуры подлежит возмещению в размере 725 руб. 59 коп.** |
| № 3 | Дещенский сельисполком | д. Володьки, 2-й проезд Строителей, уч. 1 | 0,1500 | 625680202201000237 | 9000,00 | 81, 60+ расходы на публикацию | Имеется возможность подключения к водоснабжению, электроснабжению, газоснабжению **проектирование объектов транспортной инфраструктуры подлежит возмещению в размере 725 руб. 59 коп.** |
| № 4 | Дещенский сельисполком | д. Володьки, 2-й проезд Строителей, уч. 3 | 0,1460 | 625680202201000174 | 9000,00 | 0+ расходы на публикацию | Имеется возможность подключения к водоснабжению, электроснабжению, газоснабжению **проектирование объектов транспортной инфраструктуры подлежит возмещению в размере 725 руб. 59 коп.** |
| № 5 | Дещенский сельисполком | д. Володьки, ул. Ясная, уч. 18 | 0,1442 | 625680202201000179 | 10 000,00 | 0+ расходы на публикацию | Имеется возможность подключения к водоснабжению, электроснабжению, газоснабжению **проектирование объектов транспортной инфраструктуры подлежит возмещению в размере 725 руб. 59 коп.** |
| № 6 | Дещенский сельисполком | д. Городище, ул. Центральная, уч. 10А | 0,1500 | 625680203401000040 | 9000,00 | 1364,61+ расходы на публикацию | Имеется возможность подключения к водоснабжению, электроснабжению, газоснабжению |
| № 7 | Дещенский сельисполком | д. Ладыга, ул. Ладыжская, уч. 5Б | 0,1499 | 625680207101000031 | 4500,00 | 0+ расходы на публикацию | Имеется возможность подключения к электроснабжению |

Целевое назначение участков – для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов.

Задаток в размере **10 процентов от начальной цены** земельного участка перечисляется путем безналичных расчетов платежным поручением (квитанцией) на счет № BY47AKBB36410625001146000000 Дещенского сельского исполнительного комитета в ЦБУ № 625 филиала №500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Узда, МФО AKBBBY21500, УНП 601068832.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: аг. Дещенка, ул. Школьная, 5А, кабинет управляющего делами (2-й этаж), с 8.00 до 17.00 по рабочим дням по **12 июля 2019 года** включительно.

Участники аукциона должны представить следующие документы:

заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;

заверенный банком документ об оплате задатка;

копию документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

представителем гражданина – нотариально заверенную доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан представляют документ, удостоверяющий личность.

Заключительная регистрация – с 9.30 до 9.45 в день проведения аукциона.

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников.

Оплата победителем за предмет аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов. Победителю за предмет аукциона необходимо произвести возмещение фактических расходов по организации и проведению аукциона и подготовке документации для его проведения.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, которые предлагаются для продажи на аукционе, путем самостоятельного выезда к месту нахождения этих участков.

Более подробная информация об аукционах, условиях участия размещена на официальном сайте Узденского районного исполнительного комитета info@uzda.gov.by. либо по телефонам: (801718) 35111, 35135, 35149.



**РУП «Институт недвижимости и оценки» (организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «БЗЗЧ «АВТАКО» (продавец)**

**Лот № 1.** Незавершенное законсервированное капитальное строение, инв. № 110/U-116296. Площадь – 2530,9 кв. м. Адрес: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Брестская, 311А.
**Начальная цена, бел. руб.** – 77 700,00 с НДС. **Задаток, бел. руб**. – 8 000,00. **Шаг аукциона** – 5 %

**Земельный участок:** кадастровый номер 141000000004000624, площадь – 1,0109 га. Право постоянного пользования. Переход права осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

Размер штрафа в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь по 12.07.2013 № 609 составляет 10 000,00 бел. руб.

**Аукцион состоится 12.07.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC банка BPSBBY2X, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 12.07.2019 (ОАО «БЗЗЧ «АВТАКО», Лот № 1. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 7. Окончание приема заявлений: 10.07.2019 в 11.00. Первое, полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 22.01.2019

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**



**РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего учреждению «Санаторно-оздоровительный комплекс «Белая Вежа»**

**Лот № 1.** Объект, не завершенный строительством с инвентарным номером 6852. Литер А1-А5. Назначение: нежилое здание. Площадь – 28261,10 кв. м. Готовность – 30 %. Кадастровый (или условный) номер 26:34:0:0:6852/177:1000/А1-А5. **Адрес:** Российская Федерация, Ставропольский край, г. Кисловодск, ул. Войкова, 39.
**Начальная цена продажи, рос. руб. – 259 493 000,00 без учета НДС. Задаток, рос. руб. – 12 974 650,00. Шаг аукциона – 5 %**

**Земельный участок:** Кадастровый номер: 26:34:000000:9923. Номер кадастрового квартала: 26:34:000000. Площадь: 53002+/-1 кв. м. Виды разрешенного использования: под строящийся санаторно-оздоровительный комплекс. Договор аренды земельного участка от 16.11.2017 №321/2017 на срок по 15.11.2027

**Аукцион состоится 11.07.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by.
Продавец: Учреждение «Санаторно-оздоровительный комплекс «Белая Вежа», Российская Федерация, Ставропольский край, г. Кисловодск, ул. Войкова, 39, т. +7 (928) 351-14-49.
Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки» 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11 пом. 9, тел. 8 (017) 324-70-57.
Задаток для резидентов РБ перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC банка BPSBBY2X, 220004, г. Минск. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 11.07.2019 (Учреждение «Санаторно-оздоровительный комплекс «Белая Вежа», Лот № 1. Срок внесения задатка: в рос.руб. – по 04.07.2019; бел. руб. – по 10.07.2019 до 11.00. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д.11, 3-й этаж, каб. 7. Окончание приема заявлений: 10.07.2019 в 12.00. Организатор торгов вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты его проведения. Первое, полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 04.05.2019

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**



**РУП «Институт недвижимости и оценки» (организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «УПРАВЛЕНИЕ МЕХАНИЗАЦИИ № 91» (продавец)**

**Лот № 1**. UAZ 452 кузов (рама) № 390900А0206122, 1988 г. в. Начальная цена с НДС – 3 987,84 бел. руб. Задаток – 398,78 бел. руб. **Лот № 2**. Автокран КС – 3577-3-1 (MAZ 5334 кузов (рама) № 120989), 1990 г. в. **Начальная цена с НДС – 3 603,84 бел. руб. Задаток – 360,38 бел. руб. Местонахождение Лотов: г. Минск, ул. Бабушкина, 17. Шаг аукциона – 5 %**

Аукцион состоится **04.07.2019** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.
Порядок оформления участия в аукционе, условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by. Задаток перечисляется нар/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 04.07.2019 (ОАО «УПРАВЛЕНИЕ МЕХАНИЗАЦИИ № 91», Лот №__). Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений – 01.07.2019 в 11.00. Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов. Первое, полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 19.03.2019

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

# Цёпламу чэрвеню і рыба рада



**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 1.** Возера і рака — ... для рыбака *(прык.)*. **6.** «Бойся, язь, шчупака! // ..., не дай зевака, // А то будзе гора!» З паэмы Я. Коласа «Міхасёвы прыгоды». **8.** «Будзе ... , // Будзе юшачка. // А ты, мілы дружок, — // Мая душачка». *З прыпеўкі.* **9.** «... — душа кветкі». Жуль Верн. **10.** Лёгкі ручны бур. **13.** Дробная марская рыба сямейства селядцоў. **16.** «Язі паважныя і ... , // Што тыя зебры — акуні». З верша П. Броўкі «На рыбалцы». **17.** Канаўка. **18.** Рыбацкая сетка, якой ловяць рыбу ўдвух. **19.** Сетка для лоўлі насякомых і рыбы. **21.** Лічынка камара, якая служыць прынадай для лоўлі рыбы. **24.** Сетка для лоўлі рыбы з суднаў. **25.** ... і шчупаку ўпоперак горла становіцца *(прык.)*. **27.** Нябеснае цела. **28.** Чым даўжэйшыя ... ў рыбака, тым менш веры яго байкам *(прык.)*. **29.** Бервяно, якое затанула пры сплаве.

**ПА ВЕРТЫКАЛІ: 1.** На тое і ..., каб карась не драмаў *(прык.)*. **2.** Юшка без ярша, што ... без бульбы *(прык.)*. **3.** Цёпламу чэрвеню і ... рада *(прык.)*. **4.** Зваранай рыбе ... не патрэбна (прык.). **5.** Рыбны харчовы прадукт. **7.** Тое, што і чапец. **11.** Калі свежы ..., дык і рыба на кручок *(прык.)*. **12.** Штучная прылада для лоўлі рыбы. **14.** ..., музыкант і птушкалоў — трое жабракоў *(прык.)*. **15.** Буйны беларускі горад, якому сёлета спаўняецца 1000 год з часу заснавання. **18.** Пярэдняя частка печы. **20.** Летам кожны ... начаваць пусціць *(прык.)*. **21.** Неглыбокае месца ў рацэ. **22.** Адзін закід невада. **23.** «Звонкае ... шыпшынавае. // Ціхі прытулак язёў і самоў». З верша А. Грачанікава «Дняпро. Сож. Міжрэчча». **26.** Буйная прамысловая рыба сямейства асятровых.

**Склаў Лявон Целеш,**
*г. Дзяржынск.*

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** 1. Шчасце. 6. Лешч. 8. Рыбачка. 9. Пах. 10. Шчуп. 13. Салака. 16. Карпы. 17. Равок. 18. Крыга. 19. Сачок. 21. Матыль. 24. Трал. 25. Ёрш. 27. Планета. 28. Рукі. 29. Тапляк. **Па вертыкалі:** 1. Шчупак. 2. Суп. 3. Рыба. 4. Вада. 5. Ікра. 7. Чэпчык. 11. Чарвячок. 12. Мармышка. 14. Рыбак. 15. Брэст. 18. Каптур. 20. Кусцік. 21. Мель. 22. Тоня. 23. Лета. 26. Шып.

Песню бярыце з сабою...

# ПАПАРАЦЬ-КВЕТКА

Рубрыку вядзе Яўген КСЯНЕВІЧ.
evgenyksenevich@gmail.com



**Мікола Пракаповіч (нар. 1948) — таленавіты беларускі паэт. Скончыў Брэсцкі педінстытут. У розныя гады працаваў настаўнікам, тэлеграфістам, рэдактарам брэсцкай студыі тэлебачання, журналістам газеты «Звязда». Лаўрэат прэміі «Тэлеварнышыня». Кіраваў Брэсцкім аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі. Аўтар паэтычных зборнікаў «Неад'емнае», «На кругі свае», «Мяжа надзеі», «Прытулак памяці».**

**Вершы — Мікола ПРАКАПОВІЧ, Яўген КСЯНЕВІЧ,**
**музыка — Яўген КСЯНЕВІЧ.**




***Куплет 1:***
*Не ў лагодных абдымках*
*красуні-вясны,*
*Не на лузе, дзе песціцца ветрык, —*
*Цёмнай ноччу купальскай у нетрах лясных*
*Распускалася папараць-кветка.*

***Прыпеў:***
*Папараць-кветка цвіце*
*Па ўсёй Беларусі.*
*Папараць-кветку знайду.*
*І пра лёс не журуся.*

***Куплет 2:***
*Палымнелі над рэчкай кастры*
*давідна...*
*Як язычнік, я ім памалюся.*
*І прымроіцца мне закаханы юнак*
*Пад буслiным крылом Беларусі.*

***Куплет 3:***
*Будуць песні збірацца ў чысцюткі сувой, —*
*Маці ткала, Радзіма бяліла.*
*Нібы хваля, уздыме яго над зямлёй*
*Незнаёмая дзіўная сіла.*

***Куплет 4:***
*Ён паверыць у час той, у сонечны дзень, —*
*Стол засцелюць святочным абрусам.*
*Калі людзі спытаюць: — А хто там ідзе?*
*У адказ прагучыць: — Беларусы!*

**Спадарыню Валянціну СКАРЫНКІНУ,** якая амаль сорак гадоў адпрацавала стыльрэдактарам «Чырвонай змены» і выхавала не адно пакаленне журналістаў — знаўцаў беларускай мовы, шчыра віншуем з днём нараджэння, з прыгожай круглай датай! Зычым моцнага здароўя, бадзёрасці, дабра і дабрабыту!



*Няхай вам сонца смяецца,*
*Няхай усё ўдаецца,*
*І хай будзе светлым*
*кожны Ваш дзень!*

**З удзячнасцю і павагай — чырвоназменаўцы і звяздоўцы.**

Zамор'е

## Абрабаваў два банкі з дапамогай авакада

**У ізраільскім горадзе Беэр-Шэва мужчына, узброены авакада, абрабаваў два банкі, піша брытанскае выданне Daily Mail.**



Першае рабаванне адбылося яшчэ ў сярэдзіне мая. Злачынец прыйшоў у аддзяленне аднаго з банкаў і працягнуў касірцы запіску з патрабаваннем грошай. Заўважыўшы яе ваганні, мужчына прадэманстраваў невялікі чорны прадмет і растлумачыў, што гэта граната. Ён прыгразіў пусціць яе ў ход у выпадку адмовы. Супрацоўніца банка вырашыла не рызыкаваць і аддала яму ўсю наяўнасць касы — 4,45 тысячы долараў. Праз некалькі дзён рабаўнік наведаўся ў іншае аддзяленне таго ж банка. Ён паўтарыў свой трук і ўцёк з 3,3 тысячы долараў.

Каб высачыць падазраванага, паліцыя выкарыстала даныя апаратара мабільнай сувязі. Пасля арышту высветлілася, што замест гранаты мужчына насіў з сабой авакада, пафарбаванае ў чорны колер. У мінулым ён правёў тры гады за кратамі за іншае рабаванне.

## Гаспадару забаранілі выгульваць пражэрлівую свінню

**У горадзе Вангарата (Аўстралія) улады забаранілі гаспадару выгульваць свінню на вуліцы, паведамляе выданне Daily Mail.**

Мэцью Эванс атрымаў ліст ад гарадскога савета, у якім яму паведамілі, што калі ён працягне выгульваць свайго хатняга гадаванца па мянушцы Грант па горадзе, то атрымае штраф за парушэнне грамадскага парадку звыш 800 аўстралійскіх долараў. Прадстаўнік гарадскога савета заявіў, што яны прыйшлі да такога рашэння пасля скаргаў жыхароў горада на тое, што жывёла крадзе ежу ў дзяцей. Ён дадаў, што спробы паліцыі злавіць свінню правакуюць мноства праблем. Улады адзначылі, што разумеюць неспакой Эванса датычна свайго хатняга гадаванца, але бяспека людзей на першым плане.

У сваю чаргу, Мэцью расказаў, што да гэтага без праблем выгульваў Гранта два гады запар, а таксама ўдзельнічаў у шоу, на якое яго запрасіў гарадскі савет. Ён размясціў фатаграфію папераджальнага ліста на старонцы свайго гадаванца ў сацыяльнай сетцы, дзе яго падтрымалі многія карыстальнікі. «Я люблю глядзець на Гранта на вуліцы! Я заўважыў, як ён аднойчы купаўся ў лужыне, калі я выходзіў папіць кавы. Гэта зрабіла мой дзень!» — напісаў адзін з каментатараў.



## Дрэнная навіна прынесла мільён долараў

**Жыхар амерыканскага горада Балтымар (штат Мэрыленд) не змог атрымаць грашовы прыз латарэі, згуляў у другі раз і сарваў джэкпот, піша партал UPI.**




78-гадовы мужчына, які пажадаў захаваць ананімнасць, набыў некалькі пяцідоларавых білетаў адной з латарэй у мясцовай краме. Амерыканец тут жа праверыў вынікі розыгрышу: адзін з білетаў прынёс яму 500 долараў. Тады ён звярнуўся па грошы да касіркі, якая паведаміла яму дрэнную навіну. «Дзяўчына сказала, што толькі менеджар можа выплаціць мне прызавую суму, бо грошы захоўваюцца ў сейфе, — расказвае аматар азартных гульняў. — Я не засумаваў, а пайшоў у іншую краму, дзе мае сябры ўдзельнічаюць у віртуальных скоках. Там мне прыйшла ў галаву думка купіць яшчэ латарэйных білетаў».

Пасля гэтага амерыканец заехаў у іншую краму і адзначыў свой першы выйгрыш набыццём білета іншай латарэі коштам 20 долараў. У выніку ён стаў уладальнікам мільёна долараў. Пераможца адзначыў, што жонка з цяжкасцю паверыла ў іх шанцаванне, аднак ужо прыглядае новы дом.

**Іван КУПАРВАС.**

Даты Падзеі Людзі

**15 ЧЭРВЕНЯ**



У краіне

**1954** год — нарадзіўся (вёска Згурск Чэрвеньскага раёна) Іван Іванавіч Крук, беларускі фалькларыст, кандыдат філалагічных навук. Даўні і пастаянны аўтар «Звязды». У 1975 годзе скончыў Мінскі педагагічны інстытут. Даследуе беларускі фальклор, народную культуру, беларускі народны каляндар. Аўтар манаграфій, навуковых прац.

**1979** год — нарадзілася (г. Брэст) Юлія Віктараўна Несцярэнка, беларуская спартсменка (лёгкая атлетыка, бег), майстар спорту Беларусі, майстар спорту Беларусі міжнароднага класа, заслужаны майстар спорту Беларусі. Чэмпіёнка Алімпійскіх гульняў (2004) у бегу на 100 м. Пераможца міжнародных спаборніцтваў серыі Гран-пры (2004) у бегу на 100 м. Бронзавы прызёр чэмпіянатаў свету і Еўропы, у эстафеце 4 па 100 м.





У свеце

**1215** год — група феадалаў і духавенства пры падтрымцы рыцарства і гараджан вымусілі англійскага караля Іаана Беззямельнага падпісаць грамату, якая атрымала назву «Вялікая хартыя вольнасцяў» (Magna carta). Гэты дакумент, які гарантуе каралеўскім падданым пэўныя прывілеі і правы, захоўвае ў Вялікабрытаніі законную сілу і да сёння. Грамата напісана на латыні, складаецца з прэамбулы і 63 артыкулаў і змяшчае гарантыі тых прывілеяў і свабод, якія склалі падмурак брытанскай сістэмы кіравання. З 63 параграфаў хартыі найбольш вядомы 12-ы, які забараняе каралю ўводзіць падаткі без згоды падаткаплацельшчыкаў, і 39-ы, які пазбаўляе караля права арыштоўваць грамадзян і адбіраць іх маёмасць без законнага прысуду суда. «Вялікая хартыя вольнасцяў» з часам стала разглядацца як асноватворны закон краіны. Гісторыкі і дзяржаўныя дзеячы XIX стагоддзя разглядалі Хартыю як вялікую гарантыю англійскіх свабод. У такім разуменні яна паўплывала на палітычныя і прававыя ідэі ў Амерыцы і адыграла галоўную ролю ў каланіяльны перыяд яе гісторыі, у ходзе Амерыканскай рэвалюцыі, пры складанні канстытуцыі ЗША.

**1843** год — нарадзіўся Эдвард Грыг, нарвежскі кампазітар, піяніст, дырыжор. Аўтар музыкі да драмы Г. Ібсена «Пер Гюнт», сюіты для струннага аркестра «З часоў Хольберга», канцэрта для фартэпіяна з аркестрам, струннага квартэта, «Лірычных п'ес» для фартэпіяна, рамансаў і песень. Памёр у 1907 годзе.

**1914** год — нарадзіўся Юрый Уладзіміравіч Андропаў, савецкі партыйны і дзяржаўны дзеяч, генерал арміі, Герой Сацыялістычнай Працы. З 1944 года на партыйнай рабоце ў Карэліі. З 1953 года пасол СССР у Венгрыі, у 1962—1967-м і з мая 1982-га — сакратар ЦК КПСС. У 1967—1982 гадах старшыня КДБ СССР. З лістапада 1982 года Генеральны сакратар ЦК КПСС, адначасова (з чэрвеня 1983-га) Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР. Памёр у 1984 годзе.

**1921** год — нарадзіўся Гаўрыіл Абрамавіч Ілізараў, савецкі хірург, акадэмік РАН, Герой Сацыялістычнай Працы, заслужаны вынаходнік і рацыяналізатар СССР, доктар медыцынскіх навук, заслужаны ўрач РСФСР. Больш за 30 гадоў аддаў распрацоўцы праблемы аднаўлення касцявых і мяккіх тканак, новых высокаэфектыўных методык лячэння складаных артапеда-траўматалагічных хворых. У 1988 годзе яго навуковае адкрыццё ў галіне артапедыі было ўнесена ў Дзяржаўны рэестр. Памёр у 1992 годзе.

Свята

## ДЗЕНЬ ТАНКІСТА АБ'ЯДНОЎВАЕЦЦА З WARGAMING FEST

### Арганізатары абяцаюць сюрпрызы нябачанага маштабу

**15 верасня ў парку Перамогі ў Мінску пройдзе найбуйнейшы ў Еўропе сямейны фестываль інтэрактыўных забаў.**

Свята ў мінскім парку Перамогі на Дзень танкіста, які стаў за апошнія два гады адным з самых папулярных мерапрыемстваў у жыхароў сталіцы Беларусі, у 2019 годзе выйдзе на новы ўзровень, аб'яднаўшыся з WG Fest — фестывалем аматараў гульняў Wargaming, які раней праводзіўся ў Маскве. 15 верасня «WG Fest 2019: Дзень танкіста» разгорнецца на тэрыторыі 100 га і будзе забаўляць у Мінску сотні тысяч гасцей, а распрацоўшчыкі Wargaming з усяго свету падзеляцца з імі навінамі любімых гульняў і прадставяць новыя.

«Сёлета мы ўпершыню збяром нашы найбуйнейшыя святы і нашых гульцоў разам — на самым грандыёзным сямейным фестывалі інтэрактыўных забаў на нашым кантыненце, — даволі амбіцыёзна адзначыў кіраўнік выдавецкага падраздзялення Wargaming у СНД Андрэй Мураўёў. — Калі вы хочаце адчуць максімальны ўзровень святочнай атмасферы, калі вы любіце весела праводзіць час з сям'ёй і сябрамі — абавязкова прыходзьце на «WG Fest 2019: Дзень танкіста!»

Летась на Дзень танкіста ў Мінску прыйшлі больш за 200 000 чалавек з 10 краін, і «WG Fest 2019: Дзень танкіста» рыхтуецца паўтарыць гэты поспех. Акрамя атмасферы танкавага братэрства, зносін са стваральнікамі розных гульняў і медыйнымі персонамі гасцей парку Перамогі 15 верасня будзе чакаць значна пашыраная ў параўнанні з мінулым годам праграма забаў для ўсёй сям'і. Наведвальнікаў чакаюць турніры па гульнях Wargaming з прызамі, тэматычныя фотазоны, фудкорт, атракцыёны, конкурсы, майстар-класы, канцэрт вядомых музычных выканаўцаў, маштабны феерверк і многае іншае. Уваход на свята, якое праводзіцца пры падтрымцы Мінскага выканаўчага камітэта ў рамках Дня горада, традыцыйна будзе бясплатна.



Склад музычных хэдлайнераў фестывалю «WG Fest 2019: Дзень танкіста» і дадатковая інфармацыя пра шматлікія забавы, якія ён прапануе наведвальнікам, будуць абвешчаныя пазней. Арганізатары абяцаюць сюрпрызы нябачанага маштабу.

**Іван ХВІР, фота аўтара.**

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 4.37 | 21.44 | 17.07 |
| Віцебск | 4.18 | 21.42 | 17.24 |
| Магілёў | 4.27 | 21.34 | 17.07 |
| Гомель | 4.33 | 21.21 | 16.48 |
| Гродна | 5.54 | 21.57 | 17.03 |
| Брэст | 5.04 | 21.48 | 16.44 |

## Месяц

***Першая квадра 10 чэрвеня.***
***Месяц у сузор'і Стральца.***

## Імяніны

***Пр.** Ульяны, Івана, Нікіфара.*
***К.** Віолы, Іяланты, Яны, Віта, Вітольда, Лявона.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




УСМІХНЕМСЯ

— Чаму вы забілі пяцярых чалавек?
— Не ведаю, я гуманітарый.

**З тваёй унікальнай знешнасцю прамая дарога ў вядучыя. На радыё.**

— Ёсць шмат дзяўчат, якія не хочуць выходзіць замуж.
— Адкуль ты ведаеш?
— Я ім прапаноўваў.

**— Ды мы з жонкай абсалютна розныя! Ну, вось узяць краму, напрыклад. Я наогул не разбіраюся ў малочным аддзеле. А яна губляецца ў віна-гарэлачным.**




caricatura.ru


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гомелі: 28 27 27, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by



Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.



Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1990.

| | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| М | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| П | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |

Нумар падпісаны ў 19.30 14 чэрвеня 2019 года.